Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№111 (28475)
14 чэрвеня 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



Як пазбавімся «дамоў-прывідаў»?
МС



«Гіпермаркет» у сельскай мясцовасці
МС



Адпачыць і застацца здаровым
СТАР. 13

# Гаючая калекцыя



У знаўцы і нарыхтоўшчыка лекавых раслін Аляксандра Крацёнка з Ушач у разгары палявы сезон — так званае зёлкавае жніво. Бо менавіта цяпер большаць кветак наталяюцца карыснай энергіяй, назапашваюць у свае сцябліны і карані неабходныя гаючыя якасці. Для папаўнення сваёй духмянай калекцыі раслінамі новага ўраджаю Аляксандру Віктаравічу прыходзіцца наведваць і самыя аддаленыя лясныя куточкі свайго раёна, і найбліжэйшыя ад дома лугавіны абапал азёр, і, безумоўна, свой дачны ўчастак, на якім пасаджана не меней за паўтара дзясятка карысных раслін. Сабраны ўраджай ён сартуе і сушыць у альтанцы альбо пад дахам дачнага доміка. Дзясяткі відаў і сартоў раслін ужо папоўнілі засекі ўшацкага батаніка.

— Амаль кожная расліна мае свае лекавыя асаблівасці, трэба ўмець адрозніваць іх, ведаць, у якім месцы і ў які час яны з'яўляюцца, ад якой хваробы лечаць, — кажа незвычайны калекцыянер.

Свае энцыклапедычныя веды ў батаніцы Аляксандр Крацёнак назапашваў яшчэ з дзяцінства, хоць па адукацыі — эканаміст. Яго бабуля Таццяна ведала сакрэты зёлак і дзялілася імі са сваім унукам. Пазней Аляксандру даводзілася ўзначальваць нарыхтоўчую кантору Белкаапсаюза, мець справу з найлепшымі траўніцамі вобласці. Цяпер Аляксандр Віктаравіч цалкам аддае свой час любімаму занятку і незвычайнай гаючай калекцыяй дапамагае тым, хто мае патрэбу ў леках ад матухны-прыроды.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Па газе мы вырашылі пытанне на тры гады — да 2019-га. Цяпер працягваем перагаворы, ужо на ўзроўні намеснікаў міністраў прапрацаваны падыходы парадку фарміравання і функцыянавання агульнага рынку газу пасля 2019 года і да 2025 года. Да канца месяца, я думаю, мы сустрэнемся з расійскімі калегамі і абмяркуем, як будуць фарміравацца цэны, адносіны, як будзе фарміравацца адзіны рынак газу».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8750 | ▼ |
| Еўра | 2,1013 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0720 | ■ |

## ■ Сітуацыя

# КУРОРТ БЕЗ ПЛЯЖА

### Чаму знікла інфраструктура з «малочных» берагоў

**Пляжная зона ў аграгарадку Парэчча Гродзенскага раёна сёлета пазбавілася ўсёй інфраструктуры: зніклі лаўкі, спартыўныя пляцоўкі, навесы, тэнісны стол, месцы для мангалаў, пляжныя раздзявальні, сметніцы і нават вялізныя валуны. Аб гэтым паведаміла наша чытачка Яніна Антонаўна. «Прыязджайце і паглядзіце, што стала з тэрыторыяй, дзе адпачывалі і курортнікі, і гараджане», — эмацыянальна запрасіла жанчына.**

СТАР. 3



## ■ На слыху

# ПЕРАЭКЗАМЕНОЎКА АДМЯНЯЕЦЦА!

### Што змяняецца ў атэстацыі педагагічных работнікаў?

**Пацвярджаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і катэгорыю «настаўнік-метадыст» кожныя пяць гадоў педагогам больш не давядзецца. Пастановай Міністэрства адукацыі ўнесены важныя змяненні ў Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў. Пастанова ўступіла ў сілу 31 мая.**

### Не проста імідж

Нагадаем, што «Днём ісціны» для ўсіх педагогаў, якія атрымалі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю пяць і больш гадоў таму, павінна было стаць 1 верасня 2017 года. І тыя з іх, хто да гэтага часу не пацвердзіў перад кваліфікацыйнай камісіяй свой «вышэйшы пілатаж» у прафесіі, маглі быць «разжалаваныя» — да першай кваліфікацыйнай катэгорыі. У 2012 годзе — калі змяняліся падыходы да атэстацыі — выказваліся апасенні, што большасць педагогаў будуць адмаўляцца ад пацвярджэння вышэйшай катэгорыі, улічваючы мізэрную розніцу ў аплаце. Асабліва былі пакрыўджаны педагогі, якія мелі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю ўжо 20—25 гадоў, педагогі перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту: для таго, каб і далей атрымліваць даплату за вышэйшую катэгорыю, настаўнікам-пенсіянерам таксама трэба было яе пацвярджаць. «Калі настаўнік мае станоўчыя вынікі па падрыхтоўцы вучняў да ЦТ, перамогі на алімпіядах, конкурсах, навукова-практычных канферэнцыях, калі ён друкуе свае метадычныя набыткі на старонках прадметных часопісаў — гэта і ёсць пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі, дэманстрацыя яго вопыту. Стымул для працы і адначасова зберажэнне часу і нерваў», — казалі яны.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Фактар стабільнасці рэгіёна

## Беларусь па-ранейшаму прыярытэтную ўвагу ўдзяляе падтрыманню абараназдольнасці

**Бягучы тыдзень праходзіць пад знакам рэгіянальнай бяспекі. Звязана гэта з мерапрыемствамі, прыўрочанымі да старшынства нашай дзяржавы ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Учора кіраўнік краіны сустрэўся з міністрамі абаронных ведамстваў дзяржаў-удзельніц АДКБ.**

Сёлета, дарэчы, адзначаецца 25-годдзе з моманту падпісання названага дагавора і 15-годдзе са дня ўтварэння Арганізацыі.

— Усе гэтыя гады ваенна-палітычную абстаноўку ў зоне адказнасці АДКБ нельга было назваць спакойнай, — канстатаваў беларускі лідар падчас сустрэчы з кіраўнікамі абаронных ведамстваў дзяржаў-членаў АДКБ. — На сучасным этапе яна яшчэ больш абвастраецца. Вы добра інфармаваныя пра падзеі, якія адбываюцца ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі. Упэўнены, што нашы ацэнкі сённяшняга стану пагроз у розных сферах бяспекі супадаюць.

### Найноўшая тэхніка на ўзбраенні

Калі наша дзяржава прымала старшынства ў Савеце калектыўнай бяспекі, мы вылучылі шэраг ініцыятыў, у тым ліку ў ваеннай сферы. Сярод іншага прапанавалі прыняць меры па практычнай рэалізацыі Стратэгіі калектыўнай бяспекі АДКБ, удасканаленні сістэмы крызіснага рэагавання, а таксама па паглыбленні супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы. Пералічаныя меры, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, прадыктаваныя логікай развіцця Арганізацыі, нашым бачаннем рашэння актуальных задач:

— Сёння на першы план выходзяць пытанні менавіта практычнага супрацоўніцтва па забеспячэнні стабільнасці ў рэгіёнах. Неабходна разумець, што ўсе сферы гарантавання бяспекі і дзейнасці АДКБ узаемазвязаныя. Недапрацоўкі ў рэалізацыі асобных практычных кірункаў непазбежна цягнуць за сабой тармажэнне ў развіцці ўсяго механізма. Улічваючы гэта, Беларусь выступае за як мага больш хуткае аснашчэнне Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання найноўшымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі.

Дзяржавамі — членамі АДКБ у склад Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання (КСАР) выдзеленыя найбольш боегатовыя падраздзяленні нацыянальных узброеных сіл.

— З нашага боку вы ведаеце тыя падраздзяленні, якія ўваходзяць у склад КСАР, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Прашу заўважыць, што, калі мы будзем бачыць эфектыўнасць дзеяння КСАР і патрэбнасць, мы гатовы дадаць нашы часці і злучэнні, накіраваўшы дадаткова ў склад гэтых нашых сумесных сіл.

Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу прысутных на тое, што рашэннем Савета калектыўнай бяспекі АДКБ прадугледжана аснашчэнне КСАР сучасным і, што вельмі важна, сумяшчальным узбраеннем і ваеннай тэхнікай. Дадзеная пазіцыя замацавана ў Пагадненні аб Калектыўных сілах аператыўнага рэагавання.

— На жаль, на практыцы гэтая праца прасоўваецца марудныміі тэмпамі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Безумоўна, гэта недапушчальна. У такой сітуацыі Калектыўныя сілы не дасягаюць свайго максімальнага патэнцыялу, таму працу па дадзеным кірунку неабходна актывізаваць.

### «Абкатка» ў розных краінах

— Па нашай ініцыятыве бакі восенню гэтага года запланавалі апрабаваць новую, больш маштабную форму сумеснай падрыхтоўкі фарміраванняў Калектыўных сіл АДКБ — аператыўна-стратэгічнае вучэнне, падчас якога будзе ацэнены ўзровень падрыхтоўкі штабоў і войскаў да сумесных дзеянняў, — звярнуў увагу кіраўнік краіны. — Важна не толькі «абкатаць» дзеянні войскаў у розных рэгіёнах калектыўнай бяспекі ў адзінай вучэбнай абстаноўцы, але і прапрацаваць дзеянні па папярэджанні сучасных пагроз, якія ўжо ўстойліва набылі гібрыдныя формы. Гэта рэаліі сённяшняга дня, і яны патрабуюць ад Арганізацыі адэкватнага рэагавання.

У сувязі з гэтым Беларусь падтрымала ініцыятыву фарміравання сістэмы міждзяржаўнага інфармацыйнага ўзаемадзеяння, у тым ліку Цэнтра крызіснага рэагавання і нацыянальных органаў, упаўнаважаных на ўзаемадзеянне з ім. Вельмі важна, на думку Аляксандра Лукашэнкі, каб гэтыя органы пачалі паўнацэнна функцыянаваць не толькі ў перыяд рэзкага абвастрэння абстаноўкі, але і ў паўсядзённым рэжыме.

### Ніякіх пагроз. Проста вучэнні

Беларускі лідар нагадаў усім міністрам і адказным за АДКБ работнікам, ваенным:

— Вы цудоўна ведаеце, што Беларусь і ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, і ў рамках АДКБ, адказная за заходні кірунак. Гэта зона адказнасці Беларусі, уся наша армія скануентравана на гэта разам з Расійскай Федэрацыяй. У нас выбудаваны выразны план дзеянняў у розных сітуацыях. Шмат шуму, толькі не ведаю, з-за чаго — што ў нас — у Беларусі і Расіі — пройдуць маштабныя вучэнні восенню. Як бы тут ні цінулі, нават дагэтуль: мы правядзем гэтыя вучэнні. Мы нацэлены на тое, каб вучэнні прайшлі маштабна і вельмі сур'ёзна. Ведаю, што і ў Расійскай Федэрацыі такі ж настрой.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: мы нікога не пужаем і не збіраемся гэтага рабіць.

— Нам чужога не патрэбна: як нам, так і Расіі. Свайго хапае, дай бог утрымаць. Таму мы будзем адпрацоўваць на вучэннях усё тое, што адпрацоўваюць нашы патэнцыяльныя сапернікі. Мы навучаем армію — і будзем яе навучаць — абараняць тэрыторыю нашай дзяржавы і нашы народы.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз пацвердзіў, што вучэнні праводзяцца адкрыта, на іх будуць запрошаныя ўсе прысутныя на сустрэчы міністры абароны, а таксама іншыя зацікаўленыя бакі:

— Няхай глядзяць на нашы магчымасці, але мы вельмі сур'ёзна настроены на тое, каб на тэрыторыі Беларусі вучэнні прайшлі вельмі эфектыўна. Будзем старацца надаць гэтым вучэнням і маштабы, і разнапланавы характар, каб нашы ваенныя — і расіяне, і беларусы — на гэтым кірунку адчувалі, што яны абараняюць і якія абавязкі на іх ускладзены.

Асобны тэзіс, на якім спыніўся кіраўнік краіны, — тое, што і Беларусь, і Расію часта крытыкуюць, што яны быццам бы бразгаюць зброяй.

— Ды не, мы ніякай зброяй не бразгаем. Прынамсі, ні Прэзідэнт Пуцін, ні я ніколі не прымаем замежныя войскі на сваёй тэрыторыі з такой помпай, як нядаўна, я прыводзіў прыклад, зрабіў гэта Прэзідэнт Польшчы, калі натаўскія войскі былі размешчаны проста каля мяжы з Беларуссю... Навучайцеся на здароўе, але дазвольце і нам гэта рабіць. На тое гэта і ваенныя, на тое гэта і армія. Таму яшчэ раз заяўляю вас, што ў вас ніякіх не павінна быць сумненняў у плане дзеянняў беларускіх Узброеных Сіл у зоне адказнасці на заходнім кірунку.

Прынамсі, наўрад ці ў кагосьці з міністраў абароны — удзельнікаў учарашняй сустрэчы — маглі ўзнікнуць падобныя сумненні. Беларусь вядомая сваёй адказнасцю за прынятыя абавязкі ўвогуле. А ў тым, што датычыцца абароны, — тым больш. Гэта пацвердзіў і Юрый Хачатураў, генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, заявіўшы, што Беларусь заўсёды заставалася найважнейшым фактарам забеспячэння стабільнасці на еўразійскай прасторы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Сфера дзейнасці «Ашчадбанка» ў Беларусі можа пашырыцца

**Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Германам Грэфам, прэзідэнтам, старшынёй праўлення ПАТ «Ашчадбанк» (старая назва — «Ашчадбанк Расіі»).**

— Мне заўсёды прыемна з вамі сустракацца, вы гэта ведаеце, — прызнаўся беларускі лідар. — Я гатовы да абмеркавання любых праблем, якія сёння ёсць у нашым супрацоўніцтве. Тым больш што вы вельмі актыўна ў нас працуеце ў эканоміцы: «Ашчадбанк Расіі» — актыўны ўдзельнік нашага рынку. Думаю, што поле дзейнасці трэба пашыраць, і мы пацяху будзем гэта рабіць.

У сваю чаргу Герман Грэф падзякаваў за канструктыўнае стаўленне да банка з боку беларускіх улад і звярнуў увагу, што «Ашчадбанк» у Беларусі з'яўляецца буйным гульцом на рынку. Ён паведаміў, што гэты год для працы банка ў нашай краіне выдаўся больш спрыяльным, чым мінулыя.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# СЫН НЕ АДКАЗВАЕ ЗА БАЦЬКУ

## Новае ў законе «Аб крэдытных гісторыях»

**Учора на пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу беларускія дэпутаты ў першым чытанні прынялі законапраект, які ўносіць змяненні ў Закон «Аб крэдытных гісторыях». Як адзначыў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Дзмітрый ЛАПКО, гэты праект паменшыць колькасць крэдытазалежных людзей, «якія спаборнічаюць, хто больш узяў крэдытаў».**

Дакумент прадугледжвае ўдакладненне аб'ёму самой крэдытнай гісторыі, якая павінна фарміравацца пры атрыманні крэдытаў, таксама ўдакладняецца пералік арганізацый, якія павінны працаваць у рамках гэтага праекта.

Што дае гэты законапраект? Па-першае, больш поўную інфармацыю для банкаў, па-другое, будзе ацэньвацца ступень рызык крэдытаў, а таксама надзейнасць і плацежаздольнасць кліента. Гэта значыць, што банк зможа ўбачыць, ці варта выдаваць крэдыт той ці іншай асобе, — трэба толькі прагледзець яе крэдытную гісторыю.

Што, у сваю чаргу, законапраект дае людзям? «Яны таксама будуць несці адказнасць і задумвацца перад тым, як прыцягваць рэсурсы, пры гэтым разумеючы, што іх дзейнасць будзе кантралявацца Нацбанкам дадаткова. Законапраект забяспечыць празрыстасць усіх дакументаў, а гэта значыць празрыстасць дзейнасці людзей», — адзначыла **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ.** Акрамя таго, гэта палегчыць нагрузку на сваякоў — і бацькам не прыйдзецца пагашаць крэдыты за сваіх дзяцей.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Сезон

# Пайшлі клубніцы!

## Калі не падвядзе «нябесная канцылярыя», ураджай салодкай ягады чакаецца добры

Сёлетнія ўмовы надвор'я ссунулі пачатак клубнічнага сезона прыкладна на два тыдні. У сталіцы першыя ягады толькі-толькі пачалі з'яўляцца. Напрыклад, каля станцыі метро «Каменная Горка» іх прадавалі па 7 рублёў за кілаграм. І людзі бяруць, бо ўжо пайшла палагосла, што сёлета клубніцамі можна будзе і не паласавацца.

— Сапраўды, быў такі момант, калі вяскоўцы пачалі хвалявацца: з-за працяглай засухі расліны пачалі падсыхаць. Але цяпер усё добра, пайшлі дажджы, пайшла і ягада, — расказала карэспандэнту «Звязды» **эканаміст Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства Аксана САЙКО.** — Сёлета чакаем вельмі добры ўраджай, прынамсі, прагнозы менавіта такія. Канешне, калі зноў не ўмяшаецца надвор'е.

Як паведаміла далей Аксана Пятроўна, на сённяшні дзень закупачныя цэны вызначаны толькі на таварныя ягады. Буйныя клубніцы, як той казаў, адна ў адну, прымаюць па 1,8—2 рублі, дробныя таварныя — па 1,2 рубля за кілаграм. Закупачныя цэны на ягады для вінаробства і кансервавання яшчэ не вядомыя. Як мяркуецца, яны складуць 30 і 50 капеек адпаведна і ўвядуць іх праз некалькі дзён.

Нагадаем, што мінулы год выдаўся неўраджайны — ад насельніцтва было нарыхтавана ўсяго 123 тоны клубніц. Таму сёлета пра магчымыя аб'ёмы закупак у Лунінецкім раённым спажывецкім таварыстве лічаць за лепшае не гаварыць услых. Але прагнозы добрыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пуцін абвінаваціў ЗША ў падтрымцы чачэнскіх тэрарыстаў

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў, што амерыканскія спецслужбы дапамагалі баевікам у Чачні і ігнаравалі звязаныя з гэтым пратэсты Масквы. Пра гэта ён расказаў у інтэрв'ю, якое было паказана ў фільме рэжысёра Олівера Стоўна «Інтэрв'ю з Пуціным» на тэлеканале Showtime. «Калі ў нас пачаліся праблемы ў Чачні, на Паўночным Каўказе, на жаль, амерыканцы падтрымалі гэтыя працэсы», — заўважыў расійскі Прэзідэнт. Паводле яго слоў, Расія разлічвала на дапамогу ад ЗША, але замест гэтага выявіла, што амерыканскія спецслужбы займаюцца падтрымкай тэрарыстаў.

### Саудаўская Аравія і ААЭ змякчылі паветраную блакаду Катара



Улады Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ) дазволілі авіякампаніям з трэціх краін выкарыстоўваць сваю паветраную прастору і аэрапорты падчас рэйсаў у Катар і з яго. Пра гэта паведаміла агенцтва WAM са спасылкай на заяву ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі ААЭ. Аналагічнае рашэнне было раней прынятае кіраўніцтвам цывільнай авіяцыі Саудаўскай Аравіі.

### Кіруючая кааліцыя ў Фінляндыі блізкая да развалу

Фінскі прэм'ер-міністр Юха Сіпіля заявіў, што яго кааліцыя больш не ў стане мець справу з партыяй фінскіх еўраскептыкаў, пасля таго як тыя выбралі на пасаду кіраўніка партыі прыхільніка цвёрдай лініі ў адносінах да іміграцыі. Апазіцыйныя партыі запатрабавалі аб'яўлення датэрміновых выбараў. Як вядома, трохпартыйная кааліцыя прыйшла да ўлады ў 2015 годзе, што дазволіла партыі «Сапраўдныя фіны», якая заняла другое месца, упершыню ўвайсці ва ўрад.

### У ЗША невядомы выйграў у латарэю 448 млн долараў




Паведамляецца, што шчаслівы білет быў набыты ў прадуктовай краме, размешчанай на поўдні Каліфорніі. Яе ўладальнікі атрымаюць узнагароду ў памеры 1 млн долараў. Па словах прадстаўнікоў латарэі Powerball, выйгрыш з'яўляецца дзясятым па велічыні за ўсю гісторыю правядзення розных латарэй у ЗША. Згодна з правіламі, пераможца можа атрымаць джэкпот часткамі на працягу 29 гадоў ці стаць яго ўладальнікам адразу, аднак у такім выпадку сума выйгрышу будзе прыкладна ўдвая менш.

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Рэспублікі Беларусь Лідзіі Міхайлаўне Ярмошынай у сувязі з заўчаснай смерцю СЫНА.**

## Блізкая ўлада

# Умець слухаць і рабіць высновы

**Ні адзін зварот не будзе пакінуты без увагі, паабяцаў памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Мінскай вобласці Анатоль ІСАЧАНКА падчас прыёму грамадзян у Любанскім раёне. Мясцовыя ўлады з разуменнем ставяцца да праблем людзей, імкнуцца ім дапамагчы, падкрэсліў Анатоль Міхайлавіч. Але часам узнікаюць сітуацыі, якія немагчыма вырашыць на ўзроўні райвыканкама.**



Таму патрэбна ўмяшанне трэцяга боку, так званага трацейскага суддзі, які б расставіў правільна акцэнты. «Калі адразу гэта не атрымліваецца, то можна падключыць паўторна спецыялістаў і разгледзець пытанне пад іншым вуглом», — лічыць Анатоль Ісачанка. Разам з тым ён адзначыў, што кожную праблему трэба разглядаць у межах дзеючага заканадаўства. Часам сустракаюцца факты, якія патрабуюць асаблівага, чалавечага падыходу.

Жыхар аграгарадка Малыя Гарадзяцічы Уладзімір Пекар праходзіў тэрміновую службу ў радах Савецкай арміі ў горадзе Тэрмез. Адтуль яго накіравалі ў Афганістан. Да нядаўняга часу ён лічыўся ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Але пасля перарэгістрацыі пасведчання страціў гэты статус. Справа ў тым, што адсутнічаюць дакументы, якія пацвярджалі б факт службы ў «гарачых кропках». «У мяне ёсць фатаграфіі, якія сведчаць, што я служыў у Афганістане, гэта могуць пацвердзіць і саслужыўцы», — канстатаваў Уладзімір Уладзіміравіч.

Як адзначыў старшыня райвыканкама Сяргей Казецкі, воін-інтэрнацыяналіст не пераследуе меркантыльныя інтарэсы, атрыманне льгот. Проста яму крыўдна, што не прызнаюць яго заслугі. «Калі нейкі вайсковы чын у свой час забыў падпісаць загады і аформіць дакументы належным чынам, то гэта не нагода пускаць пытанне на самацёк. Мы будзем займацца гэтай праблемай і выходзіць на вышэйшы ўзровень. Тым больш што такія прэтэндэнты ў вобласці ёсць», — адзначыў Анатоль Ісачанка.

У Мікалая Божкі забілі сына. Забойцу асудзілі на шаснаццаць гадоў, цяпер ён адбывае турэмнае пакаранне. Паводле рашэння суда злачынца павінен кампенсаваць пацярпеламу маральную шкоду. Зберажэнні, якія былі ў Мікалая Карпавіча, пайшлі на пахаванне сына. Цяпер патрэбны сродкі на помнік. Ды судовыя выканаўцы не могуць спагнаць з забойцы грошы. Як яны растлумачылі, ні ў асуджанага, ні ў яго жонкі няма ніякай маёмасці: жылі на здымнай кватэры. Удалося прадаць толькі сотавы тэлефон, а выручаныя ад яго грошы вярнуць істцу — крыху больш за 9 рублёў.

Анатоль Ісачанка даручыў спецыялістам яшчэ раз вярнуцца да гэтай тэмы, высветліць, чым займаецца асуджаны ў калоніі, колькі зарабляе. Памочнік Прэзідэнта лічыць, што можна знайсці выхад з любой складанай сітуацыі.

Кацярына Мароўская з вёскі Даросіна заклапочана закрыццём у населеным пункце вучэбна-педагагічнага комплексу «дзіцячы сад-базавая школа». Жанчыну дэлегавалі на прыём бацькі школьнікаў. Ва ўстанове адукацыі вучыцца 48 дзяцей, яшчэ 20 наведваюць дзіцячы сад. Па словах Кацярыны Аляксандраўны, сюды пераехалі некалькі шматдзетных сем'яў, будуецца жывёлагадоўчы комплекс, дзе з'явяцца новыя рабочыя месцы. Таму, на яе думку, дэмаграфічная сітуацыя будзе паляпшацца. З прапановай райвыканкама падвозіць дзяцей у школу пасёлка Урэчча бацькі не пагаджаюцца. Маўляў, далёка, там няма харчавальнага блока і якасць ежы горшая, чым у Даросіне. Акрамя таго, навучанне вядзецца на рускай мове. У той час як іх школа — беларускамоўная. Разам з тым старшыня райвыканкама растлумачыў, што бацькоў не ўдалося сабраць на агульны сход для абмеркавання сітуацыі. Прыйшоў толькі адзін чалавек.

Прадстаўнік Адміністрацыі Прэзідэнта прапанаваў мясцовым кіраўнікам больш уважліва вывучыць праблему, падысці да яе вырашэння комплексна. У прыватнасці, глыбей прааналізаваць дэмаграфічную сітуацыю ў населеным пункце, яшчэ раз сабраць бацькоў на сход пад роспіс. І разам выпрацаваць варыянт, які б задаволіў абодва бакі.

Падчас прыёму Анатоль Ісачанка выслухаў дзевяць чалавек. Заяўнікі падымалі пытанні асфальтавання вуліцы, узнаўлення руху аўтобуса па маршруце, заканчэння будаўніцтва дома за кошт ільготнага крэдыту, стрымлівання росту цэн, афармлення права ўстаноўчых дакументаў на жылы дом і інш.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## На слыху

### Заляцеў ва ўсіх сэнсах

**Днямі ў раёне пагранічнага пункта пропуску «Казловічы», што пад Брэстам, нарад памежнікаў заўважыў на вышыні каля 1000 метраў параплан, што рухаўся з боку Польшчы.**

На аб'ект звярнулі ўвагу і мясцовыя жыхары, якія праінфармавалі аб гэтым адпаведныя службы. Прыкладна за 600 метраў ад дзяржаўнага рубяжа лятальны апарат прызямліўся, а парапланерыст быў затрыманы супрацоўнікамі Брэсцкай пагранічнай групы, паведамляюць у Дзяржаўным пагранічным камітэце.

Як растлумачыў сам правапарушальнік — грамадзянін Польшчы 1975 года нараджэння — падчас палёту ён страціў арыенцір на мясцовасці. Калі прызямліўся, падумаў, што знаходзіцца паблізу польскага горада Бяла-Падляска. У адносінах да замежніка распачаты адміністрацыйны працэс за парушэнне дзяржаўнай мяжы. Няўдаламу парапланерысту пагражае буйны штраф з дэпартацыяй і забаронай на ўезд у Беларусь.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

### Прысуд пакінулі без змяненняў

#### Вярхоўны суд разгледзеў апеляцыю па справе з бензапілой

**Нагадаем, прысуд па гэтай гучнай справе быў вынесены яшчэ ў сакавіку. Тады Мінскі гарадскі суд прызнаў падлетка Уладзіслава Казакевіча вінаватым у забойстве супрацоўніцы гандлёвага цэнтра «Новая Еўропа», у замаху на забойства і злосным хуліганстве.**

Сам хлопец не раскайваўся. Наадварот: казаў, што шкадуе, што не давёў планы па масавым забойстве да канца. Але бацькі вырашылі абскардзіць прысуд. На іх думку, урачы, у якіх назіраўся іх сын, не аказалі яму патрэбную дапамогу. Яго не трэба было здымаць з уліку ў дзіцячым псіханеўралагічным дыспансеры і выпісваць таблеткі з небяспечнымі пабочнымі эфектамі (хоць самі былі не супраць і дазволілі Уладзіславу жыць аднаму). Адвакат падлетка настойваў на правядзенні паўторнай судова-псіхіятрычнай экспертызы.

Вярхоўны суд у задавальненні хадайніцтва аб паўторнай экспертызе адмовіў, аргументаваўшы адмову тым, што заключэнне спецыялістаў не выклікае сумненняў. Прысуд па справе пакінулі нязменным: 15 гадоў зняволення ў калоніі агульнага рэжыму. Права на ўмоўна-датэрміновае вызваленне ў Казакевіча няма.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### КДБ сёлета арыштаваў восем тэрарыстаў

— Пры гэтым у 2016 годзе такіх асоб было 17, а пазалетась — 21, — паведаміў **кіраўнік ведамства Валерый ВАКУЛЬЧЫК.** — Як правіла, персоны, якія звязаны з тэрарыстычнай і экстрэмісцкай дзейнасцю, знаходзяцца ў міжнародным вышуку. Былі яны і ў Сірыі.

Адзін з такіх «гасцей» прыехаў да нас з Германіі. Яго арыштоўвалі сумесна з органамі МУС. Ён меў пры сабе выбуховую прыладу і збіраўся зладзіць тэрарыстычны акт у Еўропе.

— Мы не можам дапускаць, каб у нашай краіне адбываліся такія здарэнні, у выпадку якіх гінулі б людзі, — зазначыў Валерый Вакульчык. — І таму мы мусім вельмі сур'ёзна ставіцца да такіх выпадкаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# КУРОРТ БЕЗ ПЛЯЖА




### ГАСПАДАРАЦЬ КАЧКІ

Аграгарадок Парэчча — месца вядомае. Тут знаходзіцца санаторый з аднайменнай назвай. Адразу за карпусамі пачынаецца сасновы парк, а крыху ніжэй — маляўнічае возера Малочнае. Яніна Антонаўна, з якой мы ідзем па беразе, абураецца: «Тут заўсёды ажыўлена, хтосьці каля мангала збіраецца, моладзь у валейбол гуляе, многія на пляж ідуць — купацца, загараюць. А зараз, бачыце, тут пуста, бо нават прысесці няма дзе, а купацца наогул забаранілі». І сапраўды — на ўсёй тэрыторыі ніводнай лаўкі. А да дрэва цвікамі прыбіты плакат пра тое, што купанне забаронена. Можна яшчэ і штраф атрымаць.

**У тэму**

**Каля возера Малочнае размешчана некалькі свідравін глыбінёй 450 метраў, адкуль здабываюць мінеральную ваду. Па сваіх якасцях яна адпавядае крыніцам літоўскага курорта Друскінінкай, які знаходзіцца за 18 км ад Парэчча. Вада паступае ў санаторый, а таксама разліваецца ў бутлі.**

На пляжы некалькі жанчын загараюць. Алена Пятроўна прыехала ў санаторый з Брэста. І вельмі не задаволена, бо пляжная зона не абсталявана нават самым неабходным. Яна не прадбачыла, што паміж карцінкай на сайце і рэальнасцю такая вялікая розніца. Не даспадобы жанчыне і птушыныя зграі — на пляжы нямала качак і лебедзяў. Яны тут цяпер поўныя гаспадары.

### ТЭРЫТОРЫЯ РАЗЛАДУ

Закрыццё пляжнай зоны стала праблемай і для адміністрацыі санаторыя «Парэчча». Летні сезон пачаўся, а возера недаступна. «Мы за тое, каб пляж працаваў, — кажа **дырэктар Дзмітрый КАРПІШЭВІЧ.** — Гэта зона папулярная ў нашых адпачывальнікаў». У санаторыі нават гатовы ўключыць у штат матроса-ратавальніка, які будзе там дзяжурыць. Але гэта не вырашыць праблему, заўважае Дзмітрый Леанідавіч, бо тэрыторыя патрабуе кардынальнага добраўпарадкавання.

Курортная зона, як аказалася, даўно выклікала нараканні з-за неўладкаванасці і смецця. Былы дырэктар санаторыя некалькі гадоў падтрымліваў чысціню за кошт курортнага збору, была створана і адпаведная інфраструктура. Але турыстаў станавілася ўсё болей, а рэсурсаў для прыборкі не хапала.

**Дакладна**

**Мікалай АПОН, старшыня Парэцкага сельскага Савета:**

— Наш праект «Добраўпарадкаванне прыбярэжнай паласы возера Малочнае і стварэнне веласіпеднага турыстычнага маршруту» выйшаў у другі тур конкурсу трансгранічнай праграмы «Польшча — Беларусь — Украіна». Бюджэт праекта — амаль 300 тысяч еўра. Калі выйграем грант, адразу распачнём рэалізацыю задуманага. Пракладзём і заасфальтуем веладарожкі, правядзём святло, уладкуем некалькі зон адпачынку з альтанкамі і гандлем, пабудуем масцік. Паралельна камунальныя службы будуць весці работы па ўладкаванні пляжа і воднай зоны.

У мінулым годзе ў райвыканкаме прынялі рашэнне перадаць 30 сотак прыбярэжнай паласы і 40 сотак воднай на баланс ЖКГ. Новыя гаспадары пачалі ўладкоўваць зону адпачынку па-свойму. У выніку дэмантавана частка аб'ектаў. Сёлета, перад пачаткам сезона, адсюль знікла ўся інфраструктура разам з буйкамі. Непрыстасаваны для адпачынку пляж мясцовыя ўлады вырашылі закрыць, а купанне забараніць.

### БЫЛІ І ЛОДКІ...

Парадокс, але чым папулярнейшае возера ў турыстаў, тым менш аб'ектаў інфраструктуры тут працуе. Яніна Антонаўна расказала, што некалі была лодачная станцыя, дзе можна было ўзяць напракат лодку ці катамаран. Попыт быў вялікі, чаргу займалі за некалькі гадзін. Але падзел тэрыторыі прывёў да таго, што ўласнік станцыі — санаторый «Парэчча» — закрыў свой аб'ект і вывез увесь інвентар. Аб самой станцыі нагадвае толькі стары пірс, на якім можна ўбачыць хіба што рыбакоў.

**Наша даведка:**

**Возера Малочнае ўваходзіць у склад рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры». Яго плошча — амаль 800 кв. м, даўжыня берагавой лініі — 5 км. З рыб водзяцца лешч, лінь, акунь, плотка, шчупак.**

Адзіны аб'ект, які яшчэ не знік канчаткова, — гэта былая танцавальная пляцоўка. Раней тут работнікі санаторыя праводзілі дыскатэкі, забаўляльныя праграмы, але аб'ект цяпер не запатрабаваны, зарастае травой...

### ХТО ГАСПАДАР?

А між тым узбярэжжа возера не пустуе. За дзясятак метраў ад пляжа карпусы гасцініцы ўзводзіць мясцовы прадпрымальнік Аляксандр Бычкоўскі. Работы, па яго словах, тут яшчэ на два гады. Сваю частку прыбярэжнай паласы бізнесмен прывёў у парадак: расчысціў, зрабіў спускі да вады і пляжную зону. Гэта адзінае дагледжанае месца на беразе возера, хоць аб'ектаў тут нямала. Літаральна за некалькі метраў — база адпачынку, затым дзіцячы аздараўленчы лагер (два гады не працуе), крыху далей спартыўна-аздараўленчая база з некалькімі карпусамі. Ад прыбярэжнай зоны ўсе адмажваюцца — маўляў, гэта не наша тэрыторыя, таму і сачыць за парадкам не абавязаны. І як вынік — пірсы паламаныя, бераг парос хмызняком, валяецца смецце. Недагледжаным выглядае галоўны пляж і прыбярэжная зона каля санаторыя.

### ШТО ЗМЕНІЦЦА

У Гродзенскім абласным упраўленні рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні спадзяюцца, што сітуацыю палепшыць статус курортнага пасёлка. Згодна з пастановай урада (15.12.2016 №1031), Парэчча ўключана ў спіс 16 населеных пунктаў, якія павінны стаць цэнтрамі турызму і адпачынку нацыянальнага значэння.

Мясцовыя ўлады нарэшце звярнулі ўвагу на праблемную зону. Як паведаміў **старшыня Гродзенскага райсавета Ігар ЛЯБЕЦКІ,** у гэтым годзе бюджэт выдзяляе 5 тысяч рублёў на падрыхтоўку праекта зоны адпачынку. Работы будуць весціся па выніках тэндара. Па словах Ігара Лябецкага, курортная зона набудзе новы выгляд з усёй патрэбнай інфраструктурай. Ёсць намер прыцягнуць да гэтай работы прадпрымальнікаў, якія маглі б адкрыць тут пракаты лодак і катамаранаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*
*аг. Парэчча.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПЕРАЭКЗАМЕНОЎКА АДМЯНЯЕЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выступаючы летась на жнівеньскай гарадской педагагічнай канферэнцыі, **старшыня Камітэта па адукацыі Міхаіл МІРОНЧЫК** канстатаваў трывожную тэндэнцыю зніжэння актыўнасці педагогаў у пытаннях павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі: «Нежаданне прайсці працэдуру атэстацыі азначае, што педагог не ўпэўнены ў сабе, што ў яго заніжана самаацэнка. Значыць, і ва ўстанове адукацыі не створаны ўмовы для дэманстрацыі педагогамі свайго творчага патэнцыялу. Многімі кіраўнікамі недаацэньваецца атэстацыя як адзін з рычагоў павышэння прафесійнага майстэрства педагогаў, а значыць, і ўзроўню іх заробкаў».

**Старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** адзначае: «Калі пераглядаўся парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, мы настойвалі на дыферэнцыяваным павелічэнні памераў надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі — каб заробак напрамую залежаў ад кваліфікацыі педагога і каб у апошняга быў стымул для прафесійнага росту. Гэта пазіцыя была падтрымана Міністэрствам адукацыі: ***надбаўка за другую кваліфікацыйную катэгорыю павялічылася з 15 да 30%, за першую — з 20 да 55%, за вышэйшую — з 30 да 90%, а за катэгорыю «настаўнік-метадыст» — з 40 да 120%».***

## Без згоды міністра

Што ж у рэшце рэшт змянілася для педагогаў у атэстацыі, нам расказала **галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Міністэрства адукацыі Вольга ДЗМІТРЫЕВА**:

— Па-першае, пастановай выключана неабходнасць пацвярджаць прысвоеную педагогам больш як пяць гадоў таму вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Паводле інструкцыі, кіраўнік установы адукацыі або індывідуальны прадпрымальнік, якому прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, можа ініцыяваць (са згоды педагагічнага савета ці савета ўстановы адукацыі) пацвярджэнне работнікам кваліфікацыйнай катэгорыі толькі ў выпадках, калі педагагічны работнік знізіў узровень сваёй працы альбо не займаў педагагічныя пасады больш як два гады.

Па-другое, пашыраны пералік педагагічных работнікаў, якія дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу работы на пасадзе. У прыватнасці, да іх адносяцца асобы, якія атрымалі дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вышэйшай адукацыі з адзнакай, дыплом магістра або даследчыка.

Па-трэцяе, педагагічным работнікам, якім кваліфікацыйная катэгорыя прысвоена ў замежнай дзяржаве, прадастаўлена права прэтэндаваць на прысваенне той жа кваліфікацыйнай катэгорыі, без уліку стажу работы на пасадзе.

Новай інструкцыяй таксама пашыраны паўнамоцтвы начальнікаў упраўленняў адукацыі абласных выканаўчых камітэтаў і старшыні Камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Ім прадастаўлена права даваць згоду на допуск педагагічных работнікаў да атэстацыі на прысваенне ім вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку прысвоенай раней кваліфікацыйнай катэгорыі або стажу работы на пасадзе. Раней для гэтага патрабавалася згода міністра.

Змяненні ў інструкцыі закранулі і работу кваліфікацыйных камісій. Так, кваліфікацыйныя камісіі абласных і Мінскага гарадскога інстытутаў развіцця адукацыі атрымалі права праводзіць кваліфікацыйны экзамен пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. У адрозненне ад парадку, які дзейнічаў раней, склады камісій, якія прымаюць кваліфікацыйны экзамен, будуць зацвярджацца кіраўнікамі устаноў, у якіх яны ствараюцца.

На Акадэмію паслядыпломнай адукацыі, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт і Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі ўскладзена функцыя па метадычным забеспячэнні атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) кваліфікацыйных катэгорый.

З новага дакумента таксама знік тэрмін, які абмяжоўвае падачу работнікам заявы аб атэстацыі на прысваенне яму кваліфікацыйнай катэгорыі, да 31 мая 2017 года.

## Чаму нельга спачываць на лаўрах?

Дык што ж у рэшце рэшт змянілася за няпоўныя пяць гадоў? Чаму мы зноў вяртаемся да вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі як да пажыцёвай узнагароды? І ці ўсе педагогі падтрымліваюць гэты крок? Як высвятляецца, меркаванні падзяліліся.

*«Настаўнік, які атрымаў вышэйшую катэгорыю, не павінен спачываць на лаўрах. Але я карэнным чынам змяніла б падыходы да яе пацвярджэння».*

*«Ведаю людзей, якім далі вышэйшую катэгорыю за выслугу гадоў, а яны потым ніяк увогуле сябе не праяўлялі і лічаць, што прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — гэта як грамата міністэрства «за шматгадовую і добрасумленную працу», а болей яны нікому нічога не павінны. Гэтыя, між іншым, найбольш актыўна выступалі супраць пацвярджэння. Я выключэнне зрабіла б толькі для пенсіянераў і тых, хто хутка пойдзе на пенсію. Астатнім жа для пацвярджэння ўвяла б сістэму назапашвання балаў (бонусаў) за апошнія 5 гадоў іх прафесійнай дзейнасці...»*

*«У нас ва ўсім фармальны падыход. Школьная камісія дае накіраванне на здачу экзамену ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі або Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўсім: і тым, хто хоча, і тым, хто не хоча. Узнікае пытанне, чаму? А таму, што якасць адукацыі і высокая кваліфікацыя спецыялістаў вызначаюцца не вынікамі іх працы, а рэйтынгам установы. Прыязджаюць педагогі на платныя курсы па абагульненні вопыту, для здачы на вышэйшую катэгорыю. Я прашу падняць руку тых, хто па ўласным жаданні будзе здаваць экзамен. З 25—30 чалавек толькі два-тры паднімаюць руку. Цікаўлюся ў астатніх, а што яны тут робяць? Адказваюць: «Адміністрацыя адправіла на здачу экзамену. Пагражаюць не працягнуць кантракт». Але навошта гэта патрэбна адміністрацыі? Высвятляецца, што ўсе ўстановы адукацыі ўдзельнічаюць у рэйтынгу, дзе адзін з крытэрыяў — колькасць у педагагічным калектыве настаўнікаў з вышэйшай катэгорыяй. Гэта вельмі важны паказчык у справаздачах не толькі школ, але і аддзелаў і ўпраўленняў адукацыі. Атрымліваецца, што нікога не хвалюе змест і якасць, а толькі знешні лоск і колькасць? Таму, упэўнена, што патрабуецца іншы механізм, які будзе стымуляваць настаўніка рухацца наперад і развівацца... Сістэма загнала ўсю адукацыйную прадукцыйнасць у справаздачы і адпіскі. За 25 гадоў мы іх навучыліся пісаць нават з закрытымі вачыма. Вось і атрымліваецца па справаздачах, што ва ўстановах адукацыі працуюць высокакваліфікаваныя кадры. А ў рэчаіснасці што мы маем?»*

*«А я ўскладніла б здачу на вышэйшую катэгорыю, хоць у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі яна і так была няпростая, з сур'ёзным падыходам. Не хацелася б, каб яна спускалася на тармазах у мясцовых інстытутах развіцця адукацыі. Таму што абагульненне педагагічнага досведу — рэч вельмі важная. Ты выходзіш з зоны камфорту і пачынаеш «капаць», вывучаць, даследаваць. У метадычным плане абагульненне разам з кансультацыямі спецыялістаў мне шмат дало. Я адчула свой рост у метадычным плане».*

*«Пацвярджала вышэйшую катэгорыю яшчэ ў першы год. Збіралася рабіць гэта зноў у 2018 годзе. У плане прафесійнага росту экзамен стымулюе. Не сакрэт, што абсалютная большасць педагогаў, якія маюць вышэйшую катэгорыю, не напружваюцца. І для настаўніка, які насамрэч стараецца адпавядаць крытэрыям вышэйшай катэгорыі, гэта крыўдна. Лепш бы ўвогуле не было ніякіх катэгорый. Або можна пераняць сістэму, што практыкуецца ў нефармальнай адукацыі. Кожны год зрабі, калі ласка, справаздачу, як ты расцеш. Пакажы, як навучыў усіх дзяцей. І не трэба чапляцца за дасягненні таленавітых выхаванцаў. Гэта заслуга прыроды, а не ваша. А ты паспрабуй навучыць нематываваных і тых, каму не дадзена ад прыроды. А ў нас некаторыя педагогі ўсімі праўдамі і няпраўдамі выбіваюць дыпломы і носяцца з імі гадамі, як з флагам, а над сабой не працуюць».*

*«Калі ўвогуле адмяніць экзамен на катэгорыю, то ніякага маяка наперадзе не будзе, які б сігналіў — старайся, не расслабляйся! Вышэйшая кваліфікацыя — гэта як знак якасці адукацыі, які не павінен прысвойвацца аўтаматычна».*

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «КЛИК УДАЧИ»

**Сведения об организаторе**

Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета №0064451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**Наименование Рекламной игры**

Рекламная игра носит название «Клик удачи».

**Сроки проведения Рекламной игры:**

Рекламная игра проводится с 15 марта 2017 года по 14 июня 2017 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры**

Свидетельство о регистрации Рекламной игры №2949 от 9 марта 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Количество участников Рекламной игры**

Всего к участию в игре было допущено 15 989 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда**

Призовой фонд в размере **130 497,22** (сто тридцать тысяч четыреста девяносто семь рублей двадцать две копейки) был разыгран полностью.

**Победители по результатам первого розыгрыша от 20 апреля 2017 года**

Приз первой категории: сертификат кинотеатра «Silver Screen» на получение услуг (5 сеансов на посещение кинотеатра) в ТРЦ Galileo. – триста победителей.

Полный список победителей на сайте www.360.by

Приз второй категории: сертификат на сумму 200 BYN компании 21vek.by и денежный приз для уплаты подоходного налога 30,00 BYN – пятнадцать победителей:

1. Шаблюк Алексей Сергеевич
2. Чещевик Александр Георгиевич
3. Аксючиц Алексей Сергеевич
4. Календо Дмитрий Викторович
5. Винокуров Федор
6. Остапенко Анна Юрьевна
7. Горчаков Илья Сергеевич
8. Германович Екатерина Юрьевна
9. Щербич Любовь
10. Степук Никита Игоревич
11. Напольнова Валентина Игоревна
12. Гирин Евгений
13. Кечик Юлия Викторовна
14. Хахель Юлия Владимировна
15. Хилько Юлия Владимировна

Приз третьей категории: сертификат на сумму 1000 BYN компании 21vek.by.

Денежный приз для уплаты подоходного налога 132,84 BYN – три победителя.

1. Цеховой Евгений Иванович
2. Шевчик Иван Сергеевич
3. Беломестных Алексей Николаевич

**Победители по результатам второго розыгрыша от 18 мая 2017 года**

Приз первой категории: сертификат кинотеатра «Silver Screen» на получение услуг (5 сеансов на посещение кинотеатра) в ТРЦ ARENAcity– семьсот победителей.

Полный список победителей на сайте www.360.by

Приз второй категории: сертификат на сумму 200 BYN компании 21vek.by и денежный приз для уплаты подоходного налога 30,00 BYN – тридцать пять победителей:

1. Зголич Олег Александрович
2. Зраев Алексей Викторович
3. Черкашин Александр Геннадьевич
4. Аксючиц Алексей Сергеевич
5. Корнышев Алексей Леонидович
6. Жук Алексей Сергеевич
7. Бруцкая Алена Анатольевна
8. Анатолий Иванович Галыня
9. Акулич Андрей Владимирович
10. Чернавушка Антон
11. Грецкий Артем Михайлович
12. Власов Артем Викторович
13. Журбило Артем Алексеевич
14. Хозиков Денис Николаевич
15. Нецеля Дмитрий
16. Трубников Дмитрий Николаевич
17. Левданская Ирина Николаевна
18. Лебедев Максим Борисович
19. Щеголева Мария Алексеевна
20. Пашковская Наталья Игоревна
21. Скробов Олег Петрович
22. Волкова Ольга Евгеньевна
23. Бурш Филипп Николаевич
24. Андриишин Сергей Геннадьевич
25. Дойников Сергей
26. Журич Статислав
27. Кривецкая Татьяна Павловна
28. Садыхов Теймур Фуадович
29. Яковлев Вадим
30. Диденко Виктор
31. Фролова Виктория
32. Алисеевич Виталий Игоревич
33. Дядюшкина Ольга Михайловна
34. Алимова Ольга Сергеевна
35. Терешко Юрий Михайлович

Приз третьей категории: сертификат на сумму 1000 BYN компании 21vek.by и денежный приз для уплаты подоходного налога 132,84 BYN – семь победителей:

1. Скомский Олег Михайлович
2. Синюк Дмитрий Павлович
3. Матков Эдуард Владимирович
4. Делов Игорь Александрович
5. Лысенко Кирилл Александрович
6. Савина Татьяна Викторовна
7. Вайсер Михаил Владимирович

Приз четвертой категории: автомобиль Audi A4 Sport 2.0 TFSI S tronic и денежный приз для уплаты подоходного налога 8666,95 BYN – один победитель:

1. Иванчик Анна Николаевна

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения Рекламной игры:**

публикация правил Рекламной игры – газета «Звязда», №48, 14.03.2017 г.

Публикация сведений о результатах проведения Рекламной игры – №111, 14.06.2017 г. Телефоны для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 17 239 07 70 ; + 375 29 6 308 038.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Брестоблресурсы», г. Брест, ул. Красногвардейская, 112/1 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение –**
**Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Загородная, д. 4**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание гаража** | здание специализированное автомобильного транспорта | 240,6 кв. м | 122/С-12453 |
| **Забор металлический** (инв. № по бухучету 00001047) | | 104,3 п. м | - |

**Начальная цена с НДС 20% – 26 851 руб. 72 коп.**
**(цена снижена на 45%)**

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,2613 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания гаража с установленными ограничениями: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0282 га

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». Номер счета в формате IBAN (BYN): BY60BLBB30120191021390001001 БИК в формате IBAN: BLBBBY2X

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в г. «Звязда» от 07.07.2016

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.07.2017 в 11.00 по адресу:** г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-й этаж, актовый зал |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.07.2016 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Утеряна идентификационная пластиковая карточка агента по операциям с недвижимостью ООО «ЭРА-Недвижимости» Чуйко Юлии Вячеславовны серии АВ №0015839 от 2 марта 2017 г. ИПК АВ №0015839 считать недействительной.

УНП 192619864

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
14 чэрвеня 2017 г.
№21 (405)

З МЕСЦА ПАДЗЕЙ

## Сельская гаспадарка на кантролі

**Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні выехала ў Кіраўскі раён. Там члены камісіі на чале з Аляксандрам Папковым абмеркавалі пытанне павышэння ролі і адказнасці рэгіянальных органаў улады ў забеспячэнні эканамічнай устойлівасці і інавацыйнага развіцця аграпрамысловага комплексу.**

У аграгарадку Мышкавічы размешчаны сельскагаспадарчы кааператыў «Рассвет» імя К.П. Арлоўскага. Члены камісіі разгледзелі тэму вытворчасці эканамічна выгаднай прадукцыі і прымянення энергазберагальных тэхналогій на прыкладзе цяплічнага камбіната, экалагічна бяспечных тэхналогій — на прыкладзе біягазавай устаноўкі. Акрамя гэтага, члены Савета Рэспублікі наведалі санаторый сельгаспрадпрыемства «Рассвет». У канцы дня вынікі паездкі падвялі на пасяджэнні, у якім удзельнічалі першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алег Чыкіда, старшыня Кіраўскага райвыканкама Аляксандр Бутараў, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ала Ламакіна.

*Падрабязны рэпартаж з выязнога пасяджэння чытайце ў наступным нумары «МС».*

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3-й стар.

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПА ІНШЫХ ПРАВІЛАХ

## Новая спроба пазбавіцца ад дамоў-прывідаў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ПАДЧАС камандзіровак, праязджаючы праз вёску, атрымліваеш асалоду ад зменлівых пейзажаў... І тут позірк міжволі падае на дамы і зямельныя ўчасткі: пустыя, забытыя, недагледжаныя. Не, я не кажу, што ў вёсцы гаспадар пераведзецца. Справа тут зусім у іншым — уладальнікі нерухомасці ў сельскай мясцовасці з'язджаюць у іншыя рэгіёны па розных прычынах, і зямля застаецца ўжо нікому непатрэбнай. Усё лагічна, але мясцовая ўлада можа выкарыстоўваць гэтую тэрыторыю, скажам, пад пасяўныя плошчы або перапрадаць яе з усёй нерухомасцю новаму гаспадару. Для гэтага ёсць Указ Прэзідэнта №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». Дакумент дакладна вызначае, што рабіць з такімі дамамі. Але вывучаючы скаргі чытачоў, якія паступаюць у рэдакцыю з розных куткоў нашай краіны, можна прыйсці да высновы, што Указ №100 не працуе ў поўнай меры. Таго ж меркавання прытрымліваюцца і ў Камітэце дзяржаўнага кантролю, дзе летась правялі праверку яго эфектыўнасці.**

### «Памыліліся» ў разліках... у 8 разоў

Не ўдаючыся ў падрабязнасці маніторынгу, можна сказаць, што ў КДК прыйшлі да высновы: закон трэба дапрацоўваць. Як адзначыў **начальнік упраўлення кантролю дзяржаўнай уласнасці Камітэта Мікалай ЗЕНЧЫК,** часта мясцовыя выканкамы не арганізоўвалі належным чынам работу з пустуючымі і старымі дамамі ў сельскай мясцовасці і не выконвалі ў поўнай меры патрабаванні Указа. Паводле звестак мясцовых выканкамаў, за апошнія тры гады колькасць пустуючых дамоў у цэлым па краіне павялічылася на 2 123 адзінкі і склала 13 608 аб'ектаў. Аднак па выніках маніторынгу КДК гэтая лічба не адлюстроўвае рэальнага становішча спраў. «Колькасць пустуючых дамоў, уключаных у адпаведны рэгістр, у цэлым па краіне практычна ў восем разоў ніжэйшая за іх рэальную колькасць паводле звестак статыстыкі», — растлумачыў Мікалай Зенчык.

Акрамя таго, у ходзе маніторынгу выявіліся выпадкі неабгрунтаваных выключэнняў пустуючых жылых дамоў з рэгістраў па заявах грамадзян, якія не з'яўляліся ўласнікамі жылля. Таксама ў рэгістр уключаліся дамы нават пры наяўнасці апавяшчэнняў уласнікаў аб намеры выкарыстаць іх. Такая сітуацыя ў многім абумоўлена неналежнай работай камісій па абследаванні нерухомасці, размешчанай у сельскай мясцовасці. Як вынік, супрацоўнікі КДК накіравалі інфармацыю па маніторынгу і рэкамендацыі па ліквідацыі парушэнняў мясцовым выканаўчым органам улады. Таксама праінфармавалі ўрад пра адпаведныя прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у дзеючае заканадаўства. Лёд крануўся. Што далей?

стар. 4

ПРАФІЛАКТЫКА

# Бяспека — справа асабістая і... агульная

## Пра алкаголь, кабель і вогнішча

**Кошт новай электраправодкі, замена старых газавых балонаў, начны продаж алкаголю — гэтыя і іншыя пытанні хвалявалі жыхароў Радунскага сельсавета Воранаўскага раёна на сходзе па бяспецы жыццядзейнасці. У сваю чаргу ўлады заклікалі грамадзян не перасякаць мяжу па чужым пашпарце, паведамляць пра сямейны гвалт і незаконны гандаль спіртным і ўстанаўліваць супрацьпажарныя апавяшчальнікі ў кожным пакоі.**

### ЛЯ ХАЛОДНАЙ ПЕЧЫ НЕ САГРЭЕШСЯ

Радунскі ўчастак самы складаны ў Воранаўскім раёне перш за ўсё «дзякуючы» сваім памерам і вялікай колькасці жыхароў. Праблемы, што існуюць у розных галінах, тут адпрацоўваюць штоквартальна сіламі ўсіх службаў раёна, запэўніваюць улады. На сходзе яны расказваюць, як засцерагацца ад магчымых здарэнняў, паведамляюць пра неабходныя дзеля бяспечнага жыцця змены, якія трэба зрабіць на падворках, і нагадваюць пра адказнасць за ненадбалае стаўленне да ўласных рэчаў.

Здавалася б, кожны сельчанін ведае, як паліць печ, аднак шмат хто не прытрымліваецца асноўных правілаў карыстання ёю. Не прыбівае да драўлянай падлогі металічны прытопачны ліст, не вычышчае дымаход ад сажы, не беліць комін і не правярае яго на наяўнасць шчылін. Без усяго гэтага печ ператвараецца ў «незнаёмца» з невядомымі паводзінамі, упэўнены **Сяргей ШПАРЛО, начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Удзяляюць увагу і эксплуатацыі газавых пліт з балонамі.

«У Воранаўскім раёне каля 10 тысяч газавых пліт, 3628 адзінак ацяпляльнага абсталявання і 1630 — абсталявання для нагрэву вады», — паведаміў **Ян МЯЦЕЛІЦА, начальнік Воранаўскага раёна газазабеспячэння.** Ён нагадаў, што да гэтага абсталявання заўжды павінны быць доступ, а паведамленні пра замену старых прыбораў трэба выконваць своечасова.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## КААПЕРАЦЫЯ, ІНАВАЦЫІ, ТЭХНАЛОГІІ

### Прадстаўнікі беларускага парламента наведалі з афіцыйным візітам Латвію

**Беларуская парламенцкая дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'янай Шчоткінай знаходзіцца з рабочым візітам у Латвійскай Рэспубліцы. Візіт парламенцкай дэлегацыі на чале з віцэ-спікерам верхняй палаты беларускага парламента ажыццяўляецца ўпершыню.**



У ходзе рабочага візіту сенатар правяла сустрэчы са старшынямі і членамі камісій сейма па замежных і еўрапейскіх справах, па сацыяльных і працоўных пытаннях, падчас якіх былі разгледжаны перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва ў рамках міжнародных і рэгіянальных арганізацый.

На сустрэчы Мар'яны Шчоткінай з міністрам земляробства Латвійскай Рэспублікі Янісам Дуклаўсам абмеркаваны стан і магчымасці ўзаемадзеяння ў сферы харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыла, што з улікам патэнцыялу і пазіцый Латвіі для Беларусі ўяўляюць цікавасць кантакты з латвійскімі прадпрымальнікамі ў галіне прамысловай кааперацыі, інавацый, прыцягнення новых тэхналогій, прасоўвання беларускай прадукцыі на рынак ЕС.

## ЗАКОНЫ НЕ ПАВІННЫ СТРЫМЛІВАЦЬ ЭКАНОМІКУ

### Такую думку выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах

**Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у выязным семінары-нарадзе па пытаннях развіцця Быхаўскага і Бялыніцкага раёнаў. Пры наведванні двух раёнаў парламентарыі азнаёміліся з работай шэрагу прамысловых прадпрыемстваў і сельгасарганізацый, развіццём інфраструктуры сацыяльнай сферы, абмеркавалі праблемы і перспектывы гэтых тэрыторый.**

— Падчас нарады мы ўбачылі на канкрэтных прыкладах, як развіваюцца раёны, з якімі праблемамі сутыкаюцца і якая дапамога ім неабходная, у тым ліку на заканадаўчым узроўні. Лічу, што наша галоўная задача — гэта ўдасканаленне заканадаўства. Бо жыццё не стаіць на месцы, грамадства актыўна развіваецца, і некаторыя законы патрабуюць карэкціроўкі. Нам трэба рабіць гэта своечасова, каб не стрымлівалася развіццё эканомікі, а ўзровень жыцця і дабрабыт людзей раслі, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.**

## КАНТРОЛЬ ЗА ІСПЫТАМІ

### Абмеркаваны пытанні правядзення ЦТ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава прыняла ўдзел у пасяджэнні дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2017 годзе.**

На пасяджэнні былі абмеркаваны пытанні правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і іншых уступных выпрабаванняў, ажыццяўлення кантролю за работай арганізацыйных, прыёмных і экзаменацыйных камісій устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама выкананні імі адпаведных нарматыўных прававых актаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ГЭТУ ПАЛІТЫКУ ВАРТА ЗАХАВАЦЬ

## Савет Рэспублікі наведалі прадстаўнікі парламента Ізраіля

**Беларусь і Ізраіль шмат што звязвае. Гады не толькі ўсталяваных дыпламатычных, эканамічных, гандлёвых сувязяў, але перш за ўсё чалавечых, асабістых. На тэрыторыі гэтай краіны пражывае каля 200 тысяч нашых суайчыннікаў. На мінулым тыдні верхнюю палату беларускага парламента наведала віцэ-спікер кнесэта Ізраіля, старшыня Лігі міжпарламенцкай дружбы «Ізраіль — Беларусь» Талі ПЛОСКАЎ, якая прапанавала больш актыўна развіваць турыстычную сферу нашых адносін.**



«Мы рады таму, што ў нас развіваюцца міжпарламенцкія кантакты. Іх актывізацыя ўсяляе веру і надзею, што ў нас будуць вырашацца і эканамічныя, і палітычныя, і міжнародныя пытанні. Мы досыць актыўна падтрымліваем адзін аднаго на міжнародных пляцоўках. Мяркую, нам варта гэту палітыку захаваць і, безумоўна, і надалей паглыбляць двухбаковае супрацоўніцтва», — адзначыў падчас сустрэчы **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.** Паводле яго слоў, у Беларусі і Ізраіля велізарны патэнцыял для паглыблення двухбаковага супрацоўніцтва.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента дадаў, што дагаворна-прававая база паміж нашымі краінамі ядрэнна распрацавана. «Але супрацоўніцтва — гэта як язда на веласіпедзе: пастаянна трэба круціць педалі, каб не ўпасці», — лічыць парламентарый. Менавіта таму заканадаўчыя акты павінны пастаянна працоўвацца, «каб стварыць максімум камфорту для супрацоўніцтва нашых грамадзян ва ўсіх сферах».

Акрамя таго, парламентарый прапанаваў разгледзець пытанні гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Пры гэтым краінам важна пераходзіць ад гандлёвага партнёрства да стварэння сумесных прадпрыемстваў і вытворчасцяў. На яго думку, менавіта гэта, а не «купля і продаж», цэментуе адносіны паміж дзяржавамі. Адным з такіх перспектыўных кірункаў разглядаецца супрацоўніцтва ў фармацэўтычнай галіне. Было прапанавана абмеркаваць магчымасць стварэння сумесных прадпрыемстваў і вытворчасцяў па выпуску лекавых сродкаў з наступнай арганізацыяй іх экспарту не толькі на рынак Беларусі, але і іншых краін Еўразійскага эканамічнага саюза.

«Той тавараабарот, які склаўся паміж нашымі краінамі, не задавальняе ні адну, ні другую краіну — каля $100 млн», — заявіў пасля сустрэчы **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Дзяржавы Ізраіль.** На яго думку, найбольш перспектыўныя кірункі развіцця двухбаковых адносін — навукова-тэхнічны, кааперацыйныя сувязі, турыстычны, культурны, ахова здароўя, сельская гаспадарка.

«Гэта дазволіць задзейнічаць цэлы шэраг праектаў, якія выведуць нас на добрыя вынікі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Але не ўсё заключаецца ў эканоміцы. Ёсць пытанні і палітычнага ўзроўню», — сказаў сенатар і нагадаў, як шмат беларусаў пражывае ў Ізраілі і што яны імкнуцца падтрымліваць стасункі з Радзімай. «Мяркую, у нас будзе дапрацавана дарожная карта, якая дазволіць нам больш цесна арганізаваць узаемнае супрацоўніцтва», — дадаў старшыня Пастаяннай камісіі.

У сваю чаргу Талі Плоскаў прапанавала працаваць па дакладным плане, у якім прапісаны прыкладны графік двухбаковых сустрэч, іх тэматыка. Адна з тэм — турызм. «Людзі, якія прыехалі з Еўропы, вельмі сумуюць па тых лясах і рэках, якімі шчодра адорана Беларусь. Акрамя таго, чалавек, які пражыў немалую частку жыцця тут, заўжды з радасцю вернецца на Радзіму ўжо турыстам, каб прыгадаць мінуўшчыну», — сказала замежная госця.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

## Сусветнае супрацьстаянне. Эканамічнае

### У верхняй палаце парламента абмеркавалі, як гарантаваць нацыянальную бяспеку

**Што для захавання нацыянальнай бяспекі можа зрабіць экспертная супольнасць? На гэтае пытанне шукалі адказ удзельнікі пашыранага пасяджэння навукова-кансультатыўнага савета па сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**

Адной з ключавых тэм пасяджэння стала эканамічная бяспека, якая шмат у чым вызначае ўзровень бяспекі ва ўсіх астатніх сферах дзейнасці краіны. «Супрацьстаянне ў свеце і пагрозы працягваюць перамяшчацца ў эканамічную плоскасць. Насамрэч сусветная вайна ўжо адбываецца, але ў ёй выкарыстоўваюцца новыя, менш заўважныя метады. Праціўнік прапікае на чужую тэрыторыю і пачынае фарміраваць асяроддзе, якое патрабуецца патэнцыйнаму агрэсару для дэстабілізацыі. Менавіта таму экспертнай супольнасці трэба быць больш актыўнай і рабіць канкрэтныя прапановы ў гэтай сферы», — заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.**

Акрамя таго, удзельнікі пасяджэння абмеркавалі крокі па забеспячэнні харчовай, паліўнай, інфармацыйнай, навукова-тэхнічнай бяспекі, а таксама «харчовыя», «газавыя» і «нафтавыя» войны і шляхі выхаду з іх.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## На першым плане — занятасць насельніцтва

**У ходзе рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў дзве нарады: у Івацэвічах і Іванаве.**

На нарадах разгледжаны стан сацыяльна-эканамічнага жыцця рэгіёна. Падчас абмеркавання пытанняў асаблівая ўвага ўдзялялася занятасці насельніцтва, стварэнню новых рабочых месцаў, развіццю аграпрамысловага комплексу, а таксама інавацыйнаму і экспартнаму складнікам эканамічнай галіны.

У першым квартале на Брэстчыне было звольнена з працы на 9,6% работнікаў больш, чым прынята. «Такое становішча трэба тэрмінова выпраўляць. Пытанні занятасці павінны быць пастаянна на кантролі старшыні райвыканкама», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

**Святлана Яскевіч.** *yackevich@zviazda.by*

ІНАВАЦЫІ І АПК

# ЖЫЦЬ СЁННЯ, ДУМАЦЬ ПРА ЗАЎТРА

## Адно з найбуйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці ААТ «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага можа забяспечыць электраэнергіяй увесь Кіраўскі раён

**ПА СВАІХ памерах гаспадарка нагадвае міні-гарадок, дзе на плошчы больш чым 12 тысяч гектараў размясціліся сельгасугоддзі з малочнатаварнымі комплексамі, фермамі, аўтапаркам, рыбнымі сажалкамі, садамі і нават невялічкім аэрадромам для АН-2. Самалёт тут выкарыстоўваецца для апрацоўкі пасеваў і ўнясення мінеральных угнаенняў. На балансе таварыства ёсць таксама санаторый і гасцінічны комплекс. І трэба прыкласці нямала намаганняў, каб гэта ўсё працавала. Але гаспадарка не баіцца выкарыстоўваць новыя падыходы ў рабоце. Тут дакладна ёсць чаму павучыцца. Да Кіраўска ад цэнтральнай сядзібы «Рассвета», якая знаходзіцца ў аграгарадку Мышкавічы, усяго 5 кіламетраў. Некалькі хвілін па добрай асфальтавай дарозе — і мы ўжо на месцы.**

### З мясам, малаком і агароднінай

«Рассвет» спецыялізуецца на мяса-малочнай вытворчасці і мае развітую раслінаводчую і плодаагародніную гаспадарку. У адкрытым і закрытым грунтах тут вырошчваюць памідоры, агуркі, капусту, цыбулю, моркву... Адны толькі цяпліцы тут займаюць плошчу ў 10 гектараў. З іх тры гектары адведзена пад спецыяльную энергазберагальную тэхналогію.

Звыш 200 гектараў тэрыторыі тутэйшых зямель аддадзена садам, большая частка з якіх пасаджана ў 2004—2006 гадах. Для захоўвання плодаагародніннай прадукцыі пабудавана сховішча на 5000 тон.

Сярэдняе пагалоўе буйной рагатай жывёлы складае ў гаспадарцы 8800 галоў, з іх — 2200 галоў дойнага статка. «У год вырабляем 1800 тон мяса плюс 14 300 тон малака, — удакладняе **намеснік старшыні гаспадаркі Аляксандр СУХАДОЛЬСКІ.** — Уся прадукцыя жывёлагадоўлі, якая тут выпускаецца, рэнтабельная. А рэнтабельнасць па малаку складае наогул каля 40%. Гэта значыць, што на адзін укладзены ў справу рубель мы атрымліваем 1,4 рубля выручкі».



Высокая рэнтабельнасць дасягаецца і за кошт выкарыстання якаснага насення. Напрыклад, тутэйшая кукуруза выключна нямецкай селекцыі. Яе ўраджайнасць на зерне дасягае 130 ц/га, а зялёнай масы наогул да 500 ц/га.

А яшчэ тут вырошчваюць карпа, таўсталобіка, белага амура, шчупака і карася — каля 160 тон рыбы ў год. Уся яна рэалізуецца сваімі сіламі. Для гэтага ёсць уласны транспарт і два гандлёвыя пункты ў Магілёве і Бабруйску. Працуе і выязны гандаль.

### А цяпер яшчэ і з біягазам

З 2012 года ў «Рассвеце» працуе біягазавая ўстаноўка магутнасцю 4,8 МВт/г — самая магутная ў Беларусі. Аб'ект узведзены за кошт крэдытных рэсурсаў замежных банкаў і ўкладанняў ААТ «Рассвет». Кошт устаноўкі складае 13,5 мільёна еўра, да 2019 года яна павінна акупіцца.

— На сённяшні дзень устаноўка выраблена да 20 мільёнаў кВт у год, — паведаміла **галоўны эканаміст гаспадаркі Ірына БЯЛЯЎСКАЯ.** — Уся электраэнергія, якая выпрацоўваецца ў нас, паступае ў Бабруйскія электрасеткі. Для нагляднасці, гэты аб'ём можа забяспечыць электраэнергіяй увесь Кіраўскі раён. Першыя 10 гадоў мы маем права прадаваць паліва па павышаных тарыфах, з каэфіцыентам 1,3. Так дзяржава падтрымлівае ініцыятывы па выкарыстанні альтэрнатыўных крыніц энергіі.

У аснове працэсу атрымання электраэнергіі і цяпла ляжыць анаэробнае раскладанне арганікі з дапамогай бактэрый. У суткі трэба больш чым 300 тон гною і каля 100 тон сіласу. Бактэрыі выдзяляюць газ, і турбіны выпрацоўваюць электраэнергію. Адпрацаванае «паліва» — па сутнасці той жа самы гной, але толькі палепшанай якасці і без пустазелля, ідзе на палі.

Акрамя гэтага, гаспадарка атрымлівае цяпло для сваіх цяпліц. На гэта ідзе тая вада, якая выкарыстоўваецца для ахаладжэння рухавікоў.

### Новыя магчымасці

Ад якасці біямасы залежыць і работа біягазавай устаноўкі.

— Жывёлу кормім спецыялізаванымі камбікармамі, якія самі і вырабляем, — удакладняе **Аляксандр Сухадольскі.** — Нарыхтоўваем сенажы, сілас, сена, драбнім салому і дабаўляем сакавітыя кармы. Вярнуліся да таго, ад чаго іншыя сыходзяць — да паўцукровых буракоў, там ёсць клятчатка і цукры.

Але ёсць і праблемы.

— У біямасе павінна быць не больш за 16% сухога рэчыва, — кажа **першы намеснік старшыні таварыства Аляксандр ЖЫЛІНСКІ.** — А паколькі мы ў якасці падсцілкі для кароў выкарыстоўваем здробненую салому, то перавышаем неабходныя параметры.

Сёлета гаспадарка прыступіла да будаўніцтва новага комплексу для дойнага статка, які дапаможа вырашыць адначасова дзве праблемы — павялічыць вытворчасць малака і палепшыць якасць біямасы для біягазавай устаноўкі. Асаблівасць комплексу ў тым, што там не спатрэбіцца падсцілаць каровам салому, замест яе будуць выкарыстоўвацца каўчукавыя дываны. Ёсць і іншыя плюсы. Комплекс узводзіцца побач з біягазавай устаноўкай, а гэта дазволіць скараціць транспартныя расходы. У дадатак будзе праводзіцца ацяпленне комплексу за кошт біягазавай устаноўкі.

— Будучае за інавацыйнымі праектамі, — падкрэслівае **старшыня ААТ «Рассвет» Аляксандр БАГЕЛЬ.** — Галоўнае, каб было жаданне працаваць, а не проста атрымліваць грошы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Бяспека — справа асабістая і... агульная

### НЕ СУНЬ РУКІ, БО ПРАЦЯГНЕШ НОГІ

«Тэрмін службы кабелю — 30 гадоў, проваду — 20, а вашым хатам колькі? Калі апошні раз іх мянялі?» З такім пытаннем да прысутных звярнуўся **Тадэвуш ВАЛЮКЕВІЧ, начальнік Воранаўскай раённай энергаінспекцыі.**

— Раней ад электрасеткі працавалі халадзільнік, тэлевізар ды прас. А цяпер яшчэ чайнікі, бойлеры, мікрахвалёўкі, пральныя машыны. Засцерагальнік разлічана на ток 25 А (ампер), а рэальна на яго прыпадае 35—36 — перагрузка амаль у два разы. Ізаляцыя з часам старэе, як і мы, таму яе трэба абнаўляць.

Спецыяліст папярэдзіў, што супрацоўнікі энерганагляду будуць сачыць, выносіць папярэджанні і прад'яўляць іх выкананне, а ў адмоўных выпадках — штрафаваць.

— Усе ведаюць, што «жучкі» ставіць нельга, але мы іх усё роўна знаходзім. У Воранаве зрабілі самастойна «мантаж» — згарэла кухня. У Радуні няправільна змантаваў воданагравальнік — чалавек загінуў. А ў сельгаспабудовах што робіцца? Каробкі трэба адкрываць, правяраць стан кантактаў, хоць бы пыл з іх здзьмуць...

### АГОНЬ — ДОБРЫ СЛУГА, АЛЕ ДРЭННЫ ГАСПАДАР

Згадваючы пра пажары і іх прычыны, спецыялісты каторы раз заклікаюць не пакідаць малых да 5—6 гадоў адных у хаце. Хапае некалькіх хвілін, каб здарылася бяда.

— Праз дзіцячае свавольства з агнём летась згарэла сцірта саломы на 6 тон — яе кошт спагналі з бацькоў. А ў 2015-м заняўся дом, дзе 3-гадовы хлопчык падпаліў запалкамі цацкі, пакуль яго цётка адышлася на 10 хвілін, — расказаў **Эдвард МІХАЛЬКЕВІЧ, першы намеснік начальніка Смаргонскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.** — Ёсць і кур'ёзныя выпадкі. Дзяўчынка ўбачыла ў руках малодшай сястры запалкі і выклікала пажарнікаў, спалохаўшыся. За гэта сям'ю не аштрафавалі, аднак пра кожны такі выклік дакладваюць у Воранаўскі РАУС — як пра непрынянцце мер па выхаванні дзіцяці.

Нагадалі жыхарам і пра неабходнасць вытрымліваць адлеглась у 10 метраў ад будынкаў, 20 — ад лесу і 30 — ад сціртаў з саломай, калі паліш вогнішча на прысядзібных участках і ў садовых таварыствах. Дарэчы, рабіць гэта можна толькі для гатавання ежы і палення смецця, прычым пры ветры не хутчэйшым за 5 м/сек. Штраф за падпал сухастою на ўласным падворку або за тое, што не прыбраў яго, можа даходзіць да 30 базавых велічынь.

Курэнне — прычына пажараў у 75% выпадкаў, і часта ад бяды ратуюць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. З 2002 года яны захавалі жыццё 2000 чалавек. Улады настойваюць на іх устаноўцы ў кожным пакоі.

— Шматдзетным сем'ям мы ставім іх бясплатна, на жаль, і дарэмна — таксама, каб дарэжэй не абышлося і нам, і іх суседзям. Аднак астатнія павінны самі засцерагчы ад небяспекі сваю сям'ю, — заўважыў **Мікалай РОЗУМ, старшыня Воранаўскага райвыканкама.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

### АД П'ЯНСТВА — ДВА КРОКІ ДА ЗЛАЧЫНСТВА

Не правакаваць злодзеяў на крадзяжы заклікаў **Юрый ЛАРЫЁНАЎ, першы намеснік начальніка аддзела ўнутраных спраў Воранаўскага райвыканкама:**

— Часта мы самі вінаватыя: не замыкаем хаты, пакідаем веласіпеды без ланцуга на падворку. А колькі разоў да нас звярталіся грыбнікі, якія забываліся, пад якім кустом ровар кінулі...

Штогод канфіскуецца каля 12 тон бадзяцуў рознага кштальту, і гэтая лічба амаль не мяняецца. Летась да нарколага даставілі больш за 20 чалавек, 9 хранічных алкаголікаў накіравалі ў ЛПП, дадаў спецыяліст. Ён паабяцаў разабрацца з праблемай начнога гандлю алкаголем у прыватнай краме, якую мясцовыя называюць «домам слёз жонак і маці». А каб колькасць бытавых злачынстваў памяншалася, параіў сачыць за сітуацыяй у неўладкаваных сем'ях суседзяў.

**Кірыл ФЁДАРАЎ, начальнік аддзела памежнага кантролю «Доцішкі»,** у сваю чаргу заклікаў людзей не правярць пагранічнікаў на сумленнае выкананне імі сваіх абавязкаў з аднаго боку, і на чалавечнасць — з другога.

— Прыходзіць грамадзянін перасякаць мяжу з чужым пашпартам, ну што гэта такое? Летась двойчы жыхары з дакументамі жонак так трапіліся. З пункту гледжання закона — гэта спроба перайсці мяжу пад чужым імем, за што пагражае штраф у 500 еўра і канфіскацыя дакумента. Як правіла, мы проста папярэджваем чалавека, але па пашпарт прыйдзецца прыйсці праз тры дні. Дарэчы, за знаходжанне ў памежнай зоне без пашпарта таксама можна пацярпець на такую ж суму.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)***

МЕРКАВАННІ

## «Што перашкаджае сёння больш актыўнаму зносу старых дамоў?»

**З такім пытаннем мы звярнуліся да тых, хто займаецца рэалізацыяй Указа Прэзідэнта №100 «Аб мерах па ўдасканальванні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці».**

**Старшыня Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар ЛЯБЕЦКІ:**

— Вядома, у ступар нас уводзіць сітуацыя, калі ў дома няма гаспадароў. Дакладней, людзі могуць жыць за мяжой, а дом у гэты час не абслугоўваецца, і парадак не наводзіцца. Таксама цяжкасці выклікае сітуацыя, калі на ўчастку знаходзіцца толькі падмурак або недабудаваная хата. Незразумела, што будзе далей рабіць уладальнік. Я лічу, што Указ №100, паводле якога і адбываецца знос падобных будынкаў, абавязкова патрэбны. Чаму? У нас у раёне сапраўды шмат аддаленых старых дамоў, а ў вёсках трэба наводзіць парадак. Важны момант таксама заключаецца ў тым, што потым зямлю, якая вызваляецца пасля зносу дома, мы перадаём альбо ў сельскагаспадарчы абарот, альбо тым грамадзянам, якія хочуць там нешта пасадзіць, вырасціць.

**Старшыня Жарскага сельскага Савета дэпутатаў Ушацкага раёна Святлана МІХЕЙКА:**

— Найцяжэй адшукаць нашчадкаў уладальнікаў дамоў, якія знаходзяцца ў Расіі, іншых краінах і даўно сюды не прыязджалі. Дамы стаяць недагледжаныя, траву на ўчастку ніхто не косіць. Гэта значыць, па ўсіх нормах такія дамы ўваходзяць у катэгорыю старых, трухлявых, аднак дастукацца да ўласнікаў вельмі няпроста. Больш за тое, сваякі адмаўляюцца даваць кантакты ўладальнікаў, не гаворачы сапраўдны адрас пражывання. Чаму яны так робяць? Магчыма, каб захаваць дамы. Але навошта, калі ніхто іх не даглядае? Яшчэ адзін момант — застрахаваныя хаты. Калі ёсць страхоўка, то такі дом зносіць нельга, нават калі яго стан вельмі дрэнны. Мы дасылаем іх уласнікам прадпісанні, але яны не з'яўляюцца. Многія грамадзяне лічаць, што калі яны праігнаруюць паведамленне, то ніякіх далейшых крокаў не будзе. У людзей пэўная абыякавасць з гэтай нагоды. Яны кажуць: «Мне гэта не трэба, карыстацца і прыязджаць не буду». Але пры гэтым старая хата працягвае стаяць.

**Генеральны дырэктар камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Жыллёва-камунальная гаспадарка» г. Пінска Алег КУРАДАВЕЦ:**

— Сёння сапраўды не хапае фінансаў. Тэхнічных магчымасцяў для зносу вельмі шмат, аднак існуе праблема з фінансаваннем. У нас зараз такая сітуацыя: восем дамоў трэба зносіць, а мы можам знесці толькі чатыры. Навошта трэба фінансаванне? Людзям заплаціць зарплату, тэхніку заправіць, будаўнічыя адходы прыбраць і ўтылізаваць... Вось і выдаткі. Старое жыллё, калі яно ўяўляе пагрозу жыццю і здароўю грамадзян, трэба адназначна зносіць. Складанасці перыядычна ўзнікаюць з канкрэтнымі людзьмі, паколькі кожны чалавек распараджаецца ўласнай тэрыторыяй па-свойму. Некаторыя спадзяюцца адрамантаваць дом, хоць рамонт абыдзецца ў такую суму, што танней будзе знесці старую хату і пабудаваць новую.

**Начальнік землеўпарадкавальнай службы Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Ірына ПЕТРУЧЭНЯ:**

— Наша служба вырашае пытанні па зямлі, калі ўчастак ужо свабодны, таму ў нас, па сутнасці, праблем быць і не павінна. Усё залежыць ад месцазнаходжання: калі ўчастак можна выкарыстоўваць для сяўбы сельскагаспадарчых культур, то яго мэтазгодна перадаць сельскагаспадарчай арганізацыі. У іншых выпадках на ўчастку можна размясціць аб'ект будаўніцтва — напрыклад, іншы дом. Ёсць людзі, якія маюць патрэбу ў жыллі і якія ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных межах населенага пункта могуць пабудаваць дом на гэтым месцы. Праблем у нас няма, паколькі ўсё ўрэгулявана Указам №100. Перадача зямлі залежыць ад канкрэтнага населенага пункта. Калі ў вёсцы застаецца адзін або два жыхары, то, хутчэй за ўсё, участак адыдзе сельскагаспадарчай арганізацыі, бо хто яшчэ будзе выкарыстоўваць гэтую зямлю, акрамя яе. Ёсць пустуючыя хаты і ў аграгарадках. Там дзейнічаем па сітуацыі — можна і дом пабудаваць. У кожным выпадку — сваё рашэнне.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# ПА ІНШЫХ ПРАВІЛАХ

### Запрацуе на ўсе сто?

Рэдакцыя пацікавілася, як на гэтыя рэкамендацыі адрэагавалі ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці — структуры, якая адказвала за распрацоўку Указа №100. Зараз там вядуцца гарачыя дыскусіі па ўнясенні дапаўненняў. Вынікова варыянт, вядома ж, яшчэ далёкі ад паўнавартаснага, і ўжо тым больш рана казаць пра новы, завершаны прагрэсіўны дакумент. Але заслону таямніцы ўсё ж прыўзняў **начальнік юрыдычнага ўпраўлення Дзяржкаммаёмасці Максім КАРШАКЕВІЧ.**

***— Ці будзе Указ па-ранейшаму датычыцца нерухомасці толькі ў сельскай мясцовасці?***

— Мы ведаем, што Указам №100 сёння вызначаны пакрокавы механізм дзеянняў па скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў у сельскай мясцовасці і малых гарадах. Аднак такія аб'екты маюцца і ў буйных гарадах. Пры гэтым дакладныя правілы работы з імі адсутнічаюць. Паколькі па сутнасці ўстаноўлены Указам №100 механізм можа прымяняцца незалежна ад тэрыторыі, праектам Указа прапануецца распаўсюдзіць яго дзеянне не толькі на сельскія населеныя пункты і гарады раённага падпарадкавання, але і на тэрыторыі гарадоў абласнога падпарадкавання, у тым ліку абласных цэнтраў і Мінска.

***— Ці магчымы прамы безаўкцыённы продаж старых і пакінутых дамоў патэнцыйным пакупнікам, — гэта ў большасці выпадкаў зэканоміла б час усіх зацікаўленых бакоў?***

— Сапраўды, пры карыстанні Указам №100 узнікаюць пытанні аб магчымасці прамога продажу без правядзення аўкцыёнаў. Праектам Указа прапануецца дакладна вызначыць права мясцовых выканкамаў прадаваць такія дамы як на аўкцыёнах, так і шляхам прамога продажу, і даручыць Савету Міністраў устанавіць механізм іх адчужэння. Але пры гэтым прамы продаж не будзе распаўсюджвацца на аб'екты, размешчаныя ў Мінску і абласных цэнтрах, а таксама ў населеных пунктах, якія вызначаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі з улікам інтарэсаў дзяржавы і мясцовых умоў — у гэтых населеных пунктах такія дамы будуць прадавацца толькі на аўкцыёнах. У выпадку прыняцця рашэння аб продажы пустуючага дома без правядзення аўкцыёну адпаведная інфармацыя будзе публікавацца ў перыядычных друкаваных выданнях ці іншых сродках масавай інфармацыі, а таксама на афіцыйным сайце выканаўчага камітэта ў інтэрнэце.

***— Як будзе вызначацца кошт у выпадку продажу такой нерухомасці?***

— Пачатковую цану продажу дома на аўкцыёне і яго кошт пры прамым продажы прапануецца вызначаць зыходзячы з рынкавага кошту дома. У дачыненні да дамоў, размешчаных па-за межамі Мінска, абласных цэнтраў і населеных пунктаў, вызначаных абласнымі выканаўчымі камітэтамі, устанаўліваюцца спрошчаныя патрабаванні да правядзення ацэнкі. Яна будзе праводзіцца на падставе наяўных у выканаўчага камітэта дакументаў. Гэта дазволіць знізіць выдаткі мясцовых бюджэтаў на падрыхтоўку дамоў да продажу і, адпаведна, павысіць іх прывабнасць для патэнцыйных пакупнікоў. Акрамя таго, згодна з праектам Указа можа прымяняцца механізм паніжэння пачатковай цаны продажу пустуючага або старога дома на аўкцыёне. Яна панізіцца на 20% пасля першага безвыніковага аўкцыёну альбо калі ён не адбыўся. Далей зменшыцца да 50% пасля няўдалага другога аўкцыёну і да 80% — пасля трэцяга.

***— Вядома, што сёння з заканадаўчага пункту гледжання ўцягнуць закінуты пасля смерці ўладальніка дом ва ўласнасць мясцовых выканаўчых камітэтаў досыць складана. Ці спросціцца гэтая працэдура ў новай рэдакцыі Указа?***

— Калі жылыя дамы аказваюцца закінутымі пасля смерці іх уладальнікаў у сувязі з адсутнасцю спадчыннікаў або іх адмовай прымаць спадчыну, то яны прызнаюцца судамі вымарачнымі і пераходзяць у камунальную ўласнасць. Іншае пытанне, што парадак прыняцця выканаўчымі камітэтамі рашэнняў аб далейшым выкарыстанні такіх дамоў, а таксама парадак іх продажу зацікаўленым асобам заканадаўча не ўрэгуляваны. У той жа час прынцыповая розніца паміж дамамі, закінутымі ўласнікамі, і дамамі, якія паступілі ў камунальную ўласнасць па рашэннях судоў у якасці вымарачнай спадчыны, адсутнічае. Таму ў мэтах спрашчэння парадку ўключэння ў гаспадарчы абарот жылых дамоў, якія прызналі вымарачнай спадчынай, а таксама для эканоміі бюджэтных сродкаў праектам Указа прадугледжваецца распаўсюдзіць на такія дамы адпаведныя нормы Указа №100 аб пустуючых дамах. А менавіта ажыццяўляць згодна з гэтым Указам адчужэнне, знос, замацаванне за камунальнай юрыдычнай асобай.

***— Заканадаўча працэс зносу пустуючых альбо старых дамоў можа змяніцца?***

— Цяпер мясцовы выканаўчы камітэт пры прыняцці рашэння аб зносе такіх збудаванняў павінен забяспечыць знос за свой кошт. Для змяншэння расходаў мясцовых бюджэтаў прапануецца дазволіць выканаўчым камітэтам прадастаўляць зацікаўленым асобам зямельныя ўчасткі разам з пустуючымі і старымі дамамі — з умовай іх зносу новымі землекарыстальнікамі.

***— Падчас вядзення маніторынгу ў КДК адзначылі, што рэгістры пустуючай маёмасці вяліся неэфектыўна. Ці створыць новы дакумент умовы, каб змяніць гэтую сітуацыю?***

— Праектам Указа прапануецца перайсці ад папяровай формы вядзення рэгістра ўліку пустуючых дамоў да электроннай, што дазволіць спрасціць і паскорыць абмен інфармацыяй паміж выканаўчымі камітэтамі розных узроўняў. Папяровая форма рэгістра можа быць захавана па жаданні выканаўчых камітэтаў як дадатак да электроннай. Таксама прапануецца прадугледзець вядзенне выканаўчымі камітэтамі рэгістраў уліку старых дамоў, якія раней не вяліся. Згодна з праектам Указа такія рэгістры будуць фарміравацца ў электронным выглядзе і размяшчацца на афіцыйных сайтах выканкамаў у інтэрнэце. Акрамя таго, меры па інфармаванні ўласнікаў пустуючых дамоў, пошуку гэтых асоб з дапамогай органаў унутраных спраў не заўсёды даюць неабходныя вынікі. Таму пераход да вядзення рэгістра ў электроннай форме дасць дадатковую магчымасць давядзення да праваўладальнікаў такой інфармацыі праз сайты мясцовых выканаўчых камітэтаў і адміністрацый.

***

*Як бачна, прагрэсіўныя кірункі пры падрыхтоўцы новай рэдакцыі Указа абраныя. Яны павінны забяспечыць яго эфектыўнае выкананне. Але зараз, канешне, ніхто не ведае, што з гэтага на справе будзе рэальна працаваць. Усё ўбачым з цягам часу... Ці па выніках новай праверкі.*

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

НАША ДАВЕДКА

Апавяшчэнне аб намеры выкарыстоўваць дом для пражывання павінен падаваць яго ўласнік ці іншая асоба, якая мае права пражываць у ім, у выпадку, калі ў гэтым доме ніхто пастаянна не пражывае. Яго неабходна падаваць у мясцовы выканаўчы орган кожныя тры гады. Згодна з Указам №100 непадача паведамлення і выкарыстанне жылога дома менш за 1 месяц у каляндарным годзе на працягу 3 апошніх гадоў запар прызнаецца адмовай ад права ўласнасці на яго.

Пустуючыя дамы ўлічваюцца ў спецыяльным рэгістры, які вядзецца мясцовым выканаўчым органам. Уласніку жылога дома (калі ён вядомы) загадзя паведамляецца заказным пісьмом аб уключэнні ў будучым яго дома ў рэгістр. Пасля атрымання апавяшчэння ён можа накіраваць паведамленне пра свой намер выкарыстоўваць дом. У гэтым выпадку яго маёмасць у рэгістр не ўключаецца.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***Пустуючыя дамы*** *— размешчаныя ў сельскай мясцовасці жылыя дамы (за выключэннем жылых дамоў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі або без іх, у дачыненні да якіх на 1 студзеня кожнага каляндарнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што на працягу апошніх трох гадоў запар асобы, якія маюць права карыстання імі, жывуць у іх у сукупнасці менш за адзін месяц у каляндарным годзе і ў дачыненні да якіх не прадстаўлены пісьмовыя паведамленні аб намеры выкарыстоўваць іх для пражывання.*

***Старыя дамы*** *— размешчаныя ў сельскай мясцовасці жылыя дамы (за выключэннем жылых дамоў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі або без іх, прызнаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку не адпаведнымі санітарным і тэхнічным патрабаванням або непрыдатнымі для пражывання, у дачыненні да якіх на 1 студзеня кожнага каляндарнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што гэтыя дамы ўтрымліваюцца безгаспадарча, асобы, якія маюць права карыстання імі, на працягу апошняга года не жывуць у іх і не прымаюць мер да аднаўлення гэтых дамоў для выкарыстання па прызначэнні.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*

ВОПЫТ

# КАБ НЕ ПСАВАЛІ КРАЯВІДЫ

## Як распарадзіцца старымі дамамі па-гаспадарску

**За дзень са старшынёй Ляхавіцкага раённага Савета дэпутатаў Яўгенам ЮРЛЕВІЧАМ мы праехалі больш за дзясятак вёсак. Даваўся ўбачыць многія гектары пасеваў, якія зеляненюць на месцы былых нічыйных сядзіб. Зразумела, што гэта работа па добраўпарадкаванні вядзецца сістэмна. Дастаткова сказаць, што ў адным з самых невялікіх раёнаў вобласці за мінулы год было знесена 59 пустуючых дамоў і адпаведна столькі ж участкаў прыведзена ў парадак.**

### Участак пад пасевы

У вёсцы Задвор'е Альхоўскага сельсавета пры самым уездзе да нядаўняга часу краявіды псаваў стары трохкватэрны дом-барак. Некалі гэта было жыллё аднаго з мясцовых прадпрыемстваў. Потым людзі палепшылі свае ўмовы, з'ехалі, а пабудова разбурылася. Яе знеслі, а заадно добраўпарадкавалі навакольную тэрыторыю. У выніку льнозаводу перадалі некалькі гектараў ворыўнай зямлі. Сёння поле засеяна яравымі культурамі.

— Работа праведзена за кошт гаспадаркі «Ляхавіцкі райаграсэрвіс» і бюджэтных грошай у прапорцыі 50 на 50, — расказвае **старшыня Альхоўскага сельскага Савета дэпутатаў Вячаслаў КУЛАК.** — А ўсяго за 2016 год мы знеслі два дзясяткі старых нічыйных дамоў. Зараз праблемныя застаюцца 38 домаўладанняў, па чатырох вядзецца работа.

— З пачатку дзейнасці Указа №100 у гэтым сельсавеце ўведзены ў севазварот зямлі прыкладна сотні былых сядзіб, — дапаўняе старшыня райсавета. — Уяўляеце, які «парадак» быў бы ў вёсках, каб яны стаялі і зарасталі бур'янам?

Важнасць такой работы ніхто пад сумненне і не ставіць. Яна відавочная.

У Крывошынскім сельсавеце давялося застаць за работай брыгаду ПМК-17, якая якраз займалася добраўпарадкаваннем тэрыторыі пасля зносу дамоў. Старшыня сельвыканкама Юрый Чаранкевіч патлумачыў, што на гэты год запланавана работа па ліквідацыі 11 трухлявых дамоў, летась разабраліся з 18-ю пабудовамі. Механізм ужо адпрацаваны. Знаходзіцца арганізацыя, найчасцей ЖКГ, якая разбірае дом на дровы. Драўніна ідзе на ацяпленне бальніцы, іншых сацыяльных устаноў, што знаходзяцца ў вёсках. Шыферу і фундаменту, як правіла, камунальнікі таксама знаходзяць прымяненне. Для ўсяго, што застаецца, выкопваецца яма-катлаван, у якую ссоўваецца рэшткі былой пабудовы.

У вёсцы Стральцы экскаватаршчык Анатоль Секач якраз займаўся ўладкаваннем былога ўчастка. Аб тым, што тут была гаспадарская сядзіба, нагадвалі здзічэлыя клубніцы, якія і ў буйной траве дружна зацвілі насуперак імкненню зраўняць з зямлёю ранейшы агарод...

Жыхар вёскі, дэпутат сельскага Савета Іосіф Зубік таксама паспрыяў наведзенню парадку на вуліцы. Многія з нашчадкаў гаспадароў пакінутых дамоў — таварышы па школе, а то і аднакласнікі Іосіфа Іосіфавіча. Ён звязваўся з імі,



Старшыня Крывошынскага сельскага Савета дэпутатаў Юрый ЧАРАНКЕВІЧ *(справа)* на пляцоўцы, дзе зносяць дом.

прасіў скласці дакументы, якія далі б права сельвыканкаму распарадзіцца маёмасцю. Некаторыя, праўда, праявілі адказнасць і самастойна разабралі бацькоўскія хаты. Такім чынам у Стральцах засталіся толькі тыя пабудовы, якія даглядаюцца і падтрымліваюцца законнымі ўладальнікамі. Яшчэ вясковы дэпутат сказаў, што, на яго думку, заканадаўства ў нас занадта ліяльнае па гэтым пытанні. Ён даваў бы толькі год на роздум пра далейшы лёс і ўступленне ў правы спадчынніка, а далей права распараджацца атрымлівала б мясцовая ўлада.

### Новы статус былога жылля

**Старшыня Ганчароўскага сельскага Савета дэпутатаў Уладзімір ПЛЕСКАЦЭВІЧ** расказаў пра яшчэ адну форму ўладкавання старых дамоў. Так, у вёсцы Набярэжная іх ахвотна купляюць. І прычынай таму найперш Мініцкае вадасховішча. Вадаём славіцца ў акрузе добрай рыбалкай, ды і месца адпачынку надзвычай прыгожае. Возера відаць нават з вокнаў асобных дамоў. Дык чаму ж іх не купляць? Трэба сказаць, тут і цана на іх трымаецца стабільная.

Напрыклад, жыхар Баранавіч Міхаіл Луціч набыў зусім старэнькую хату. А сёння яна выглядае ўжо даволі прывабна. «Дом падымалі, залівалі новы фундамент, сцены ўмацоўвалі», — расказвае Міхаіл Анатолевіч. Бярвенні, моцна паедзеныя шашалем, зрабілі своеасаблівай «фішкай». Зараз у доме паявіліся новыя столь і падлога, абсталяванае памяшканне пад кухню і санвузел, дабудаваная тэраса. З часам у гаспадара паявіцца цудоўны загарадны дом для адпачынку... Дарэчы, Міхаіл Луціч тут не адзіны новы гаспадар, у яго ўжо ёсць суседзі не толькі з Баранавіч, але і з Масквы. Яны таксама купілі старыя дамы ў вёсцы.

Старшыня сельвыканкама Уладзімір Плескацэвіч кажа, што ў іх ёсць яшчэ некалькі маляўнічых вёсак, куды не даехалі гараджане-пакупнікі. І сёння мясцовая ўлада думае аб формах рэкламы, бо грэх жа зносіць былое жыллё там, дзе яно яшчэ можа паслужыць людзям.

У Жарабковіцкім сельсавеце старыя хаты купляе гаспадарка. Такая практыка склалася даўно, яшчэ з часоў, калі мясцовым калгасам кіраваў вядомы на Брэстчыне аграрый Віталь Бусько. Ён ніколі не сяліў у новы калгасны дом работніка, пакуль той не прайшоў «каранцін» у старой вясковай хаце. Калі сям'я зарэкамендавала сябе як руплівыя акуратныя гаспадары, ім давалі камфортнае жыллё. А некаторыя потым і самі не хацелі перахадзіць у мураваныя асабнякі, заставаліся ў драўляных. І цяперашні **дырэктар ААТ «Жарабковічы» Антон БУЛАТЫ** традыцыю не проста працягнуў, а лічыць яе адным з добрых спосабаў вырашэння жыллёвага пытання.

— За апошнія пяць гадоў купілі каля 30 дамоў у вёсках, — гаворыць Антон Тадэвушавіч. — Зусім трухлявыя пайшлі на дровы, а лепшыя мы рамантуем і засяляем у іх работнікаў. У былых вясковых хатах у нас зараз жывуць, жывёлаводы, механізатары.

На адной толькі вуліцы цэнтральнай сядзібы гаспадаркі мы налічылі больш за паўдзясятка такіх дамоў.



Новае жыццё хаты ў в. Набярэжнай.

У адзін з іх завіталі. Маладыя гаспадары Карына і Мікалай Папрынцавы з задавальненнем паказалі жыллё. Аказалася, абое прыехалі з Данецкай вобласці. Сельскагаспадарчы тэхнікум, у якім яны вучыліся, закрываўся, маладыя людзі змаглі працягнуць вучобу ў Ляхавіцкім аграрным каледжы. Мікалай атрымаў спецыяльнасць ветэрынара, уладкаваўся на работу ў гаспадарку. Сям'і далі дом, які сельгаспрадпрыемства адрамантавала.

— У доме да нашага прыезду ўжо быў праведзены рамонт: памянялі вокны, дзверы, паклеілі шпалеры, правялі ваду і ацяпленне, — расказвае Карына. — Мы толькі мэблю сваю паставілі. Дом вялікі, прасторны, дачушцы тут падабаецца, мы проста шчаслівыя, — працягвае маладая гаспадыня.

Сельгаспрадпрыемства робіць поўны рамонт і выдзяляе працаўнікам такія дамы ў якасці службовага жылля. Але ў гаспадароў ёсць права з часам выкупляць іх ва ўласнасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Ляхавіцкі раён.*

ПРАБЛЕМНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ

# КАЛІ БУДЫНАК СТАНОВІЦЦА НЕБЯСПЕЧНЫМ

**Работнікі пракуратуры высветлілі шмат «нерухомых праблем». Без уладальнікаў будынкі разбураюцца, часцяком знаходзяцца ў аварыйным стане. Бывае, становяцца і месцам застолляў і начлегу для бяздомных. Пры гэтым «мёртвая» нерухомасць нават не ўключаецца ў адпаведныя спісы аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца.**

— Парушаюцца патрабаванні Указа Прэзідэнта «Аб парадку распараджэння дзяржаўнай маёмасцю». Падобныя аб'екты доўгі час незапатрабаваныя і потым руйнуюцца...

Парушаецца заканадаўства і пры афармленні адпаведных дагавораў куплі-продажу, актаў аб прыёме-перадачы маёмасці і іншых дакументаў. Мясцовыя ўлады не заўсёды ажыццяўляюць належны кантроль за выкананнем абавязковых умоў адпаведных дагавораў. Своечасова не вырашаюцца пытанні прыцягнення вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці. І маёмасць у камунальную ўласнасць не вяртаецца, — расказвае **Марына ЗАПРУДСКАЯ, пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці.**

Паралельна парушаецца Дырэктыва Прэзідэнта №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны». У будынках, якія, зразумела, не ахоўваюцца, выпіваюць і спяць бяздомныя.

У вёсцы Двор Бабча Лепельскага раёна бібліятэку пабудавалі ў 1960-я. Не выкарыстоўваецца яна каля 7 гадоў. Будынак стаў месцам, дзе бавілі час грамадзяне, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Работнікі пракуратуры падчас рэйду ўбачылі пустыя бутэлькі ад спіртнога, смецце і г. д. Яны сфатаграфавалі і прабоіны ў падлозе, і вокны без шкла... Разбураныя канструкцыі будынка небяспечныя.

Аналагічнае адбываецца і ў былой сельскай бібліятэцы ў вёсцы Матырына Лепельскага раёна. Яе неаднаразова выстаўлялі на продаж праз аўкцыён. Аднак не купілі.

— Пасля гэтага захаванасць будынка не забяспечвалася. Дзверы і вокны былі адчыненыя. Былая ўстанова культуры ператварылася ў нелегальную «чарачную». І яе «кліенты» істотна пашкодзілі памяшканні. Падлогі, сцены і дах у аварыйным стане. Пры гэтым праблемная нерухомасць знаходзіцца ў цэнтры населенага пункта, — канстатуюць у раённай пракуратуры.

А ў гарадскім пасёлку Бягомль у аварыйным стане былы цэх дрэваапрацоўкі арганізацыі ЖКГ. Гэтая нерухомасць доўгі час не эксплуатуецца. Дах разбураецца, часткова



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

адсутнічаюць сцены... І ўсякае можа здарыцца, калі нехта ўвойдзе ўнутр, бо ёсць небяспека траўміравання.

Работнікі пракуратуры вынеслі кіраўнікам органаў улады, суб'ектаў гаспадарання 11 прадстаўленняў і прадпісанняў. Вінаватыя павінны быць прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

ТАЛАКОЙ

# І ВЁСКА НІБЫТА ПАСВЯТЛЕЛА

## Як у Клецкім раёне вырашаюць праблему добраўпарадкавання

**ВЁСКА Дунайчыцы Кухчыцкага сельсавета Клецкага раёна з ліку неперспектыўных. Колькі гадоў таму тут было нямала закінутых домаўладанняў, пакуль мясцовыя ўлады не ўзяліся за навядзенне парадку...**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Каля дома на вуліцы Савецкай завіхаюцца рабочыя — высеклі кусты і прыступаюць да разбору драўлянай пабудовы. Але мужчыны ў нерашучасці: на самым версе страхі буслы звілі сабе жытло.

— Перанясіце буслянку ў іншае месца, — раю ім.

— Гэта зрабіць няцяжка. Ды баімся: існуе павер'е, што нельга парушаць пакой гэтых птахаў, каб не наклікаць няшчасце на вёску, — дзеляцца сумненнямі мае суразмоўцы.

Пакуль яны рашаюць праблему месца буслінай прапіскі, накіроўваюся да іншага падворка. Будынак тут ужо практычна разбураны. Засталося прыбраць, а затым рэкультываваць участак. Насупраць яшчэ адзін дом. На першы погляд, выглядае няўдрэна. Тым не менш унутры гнілая падлога, напаўразбураная печ, са столі сыплецца труха.

— Такія пабудовы немэтазгодна перадаваць на баланс гаспадаркі, у нашым выпадку агракамбіната «Туча» — кіруючая кампанія «Мінск-Крышталь». Каб прывесці будыніну ў належны стан, які б адпавядаў супрацьпажарным, санітарным нормам, трэба ўкласці вялікія грошы, — тлумачыць **старшыня Кухчыцкага сельскага Савета Святлана ТУРКО.** — Калі ў такіх трухлявых дамоў ёсць юрыдычны ўласнік, мы з ім працуем. Не прэтэндуе на сваю спадчыну чалавек — бяром у яго натарыяльна завераную адмову. Затым сельвыканкам прымае рашэнне аб далейшым лёсе дома. Як правіла, усе яны напаўразбураныя, таму адназначна падлягаюць зносу, а зямля перадаецца гаспадаркам для прыцягнення ў гаспадарчы абарот.

Хоць праблем па зносе пабудоў хапае. Часта «радавое гняздо» стаіць без нагляду гадамі, рушыцца. Трухлявыя дамы павінны са згоды спадчынніка перадавацца для далейшага выкарыстання суб'ектам гаспадарання. Але ў іх звычайна няма ўласнікаў. Як правіла, па хадайніцтве мясцовых улад суд прызнае іх безгаспадарчымі. Разам з тым у далейшым можа аб'явіцца спадчыннік, які праз дзясяткі гадоў раптам успомніў, дзе нарадзіўся, і прад'явіць прэтэнзіі: навошта разбурылі бацькоўскае гняздо? Такія прэцэдэнты ў Мінскай вобласці ўжо былі. Атрымліваецца, што сельвыканкам не застрахаваны ад такіх выпадкаў. **У раёне лічаць, што сапраўды наспеў час уносіць змяненні ва Указ Прэзідэнта №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці», якія гарантавалі б абарону сельвыканкамам і ўзмацнялі адказнасць спадчыннікаў.** Такія прапановы раённыя ўлады накіравалі ў Мінскі аблвыканкам.

У Дунайчыцах ёсць дамы, гаспадары якіх знаходзяцца ва ўстановах сацыяльнага пражывання. Звычайна гэта пажылыя людзі, у якіх няма ні сваякоў, ні блізкіх, якія маглі б дагледзець за нерухомасцю.

— У гэтым выпадку мы бяром у адзінокага чалавека дазвол, каб увесці зямлю вакол дома ў севазварот. Участак засяваем культурнымі травамі, збажыной, — кажа Святлана Анатолеўна.

На тэрыторыі сельсавета 13 населеных пунктаў, у тым ліку два аграгарадкі. Работа па добраўпарадкаванні вядзецца планамерна. У 2015 годзе знеслі 45 пустуючых і старых дамоў, у 2016-м — 22, сёлета за студзень — красавік — 20. У Клецкім раёне існуе добрая традыцыя: наводзіць парадак у сельскай мясцовасці талакой. Па распараджэнні старшыні райвыканкама Генадзя Салаўя ладзяцца суботнікі, і ўсе сілы накіроўваюцца на адпрацоўку аднаго канкрэтнага населенага пункта.

— Напрыклад, у сакавіку «дэсант» высадзіўся у Дунайчыцах. У ім прыняло ўдзел каля 300 чалавек з 22 раённых арганізацый. Кожная з іх забяспечыла сваіх людзей неабходнай тэхнікай, матэрыяламі, інструментамі, — канстатуе Святлана Турко. — У гэты дзень было прыбрана 26 участкаў. Акрамя таго, вялікую дапамогу нам аказваюць сельгасарганізацыі. Знос аднаго дома каштуе прыкладна 1000 рублёў. Вядома, нятанна, але яны ідуць на гэта, каб прыцягнуць зямлю ў севазварот: працуюць на перспектыву.

Гаспадаркі забіраюць сабе драўніну, якой ацяпляюць памяшканні. Рэшткі мураўкі ідуць на ўладкаванне дарог, пад'ездаў да ферм, вытворчых памяшканняў. Што датычыцца фундамента і падвалаў, то яны засыпаюцца зямлёй і рэкультывуюцца. На ўчастках вакол пустуючых домаўладанняў часта ствараюцца звалкі. Чаго там толькі няма: пластыкавыя пакеты і бутэлькі, шкляны посуд, папера. У Кухчыцкім сельсавеце сёлета правялі эксперымент: накіравалі сюды грамадзян, якія адпрацоўвалі грамадскія работы. Яны асобна сабралі адходы па відах. Затым рассартаваную непатрэбшчыну мясцовая ЖКГ вывезла на перапрацоўку.

Вёска апошнім часам папрыгажэла і нібыта пасвятлела. Там, дзе стаялі развалюхі і рос быльнёг, цяпер з'явіліся роўныя, акуратныя лапікі пасеваў. Зрэшты, ва ўсім Клецкім раёне населеныя пункты мяняюцца на вачах. Разам з тым, як адзначыў старшыня райвыканкама Генадзь Салавей, у раёне застаецца 259 пустуючых дамоў. Нягледзячы на тое, што зносу надаецца значная ўвага, колькасць іх не зніжаецца — пажылыя людзі паміраюць, маладыя не вяртаюцца. Па словах Генадзя Міхайлавіча, добраўпарадкаванне перш за ўсё мае на мэце рацыянальнае выкарыстанне зямлі. За апошнія тры гады тут увялі ў севазварот 1300 гектараў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

ФАКТ

## Не плач, сабака

**Зноў у добрым сэнсе слова вылучыліся бабруйскія ратавальнікі. На гэты раз іх дапамога спатрэбілася... сабаку, які на самай справе быў на валаску ад смерці.**

— З прыватнага сектара на пульт дзяжурнага паступіла паведамленне, што ў жывёлы захрасла лапа, — расказаў падрабязнасці гісторыі **ратавальнік пажарнай аварыйна-выратавальнай часці №4 Эміль ТКАЧЭНКА.** — Але калі мы прыехалі, то ўбачылі, што дамашні вартаўнік не толькі зашчаміў сабе лапу, але яшчэ і зачапіўся пашчай за карабін павадка. Відовішча было не для слабанервовых. Небарака нібыта сядзеў на кручку.

Падысці да раз'юшанай жывёлы не мог нават гаспадар. Па сутнасці, сабака — шчаня, 8 месяцаў, але вагой кілаграмаў 20, не меней. Каб дапамагчы яму вызваліцца з пасткі, спатрэбілася выклікаць яшчэ і ветэрынара. Пасля ўколу ахвяра карабіна крыху паспакайнела і дала магчымасць наблізіцца. Але зняць яе проста так з «кручка» не атрымалася. Эміль Ткачэнка разам з кіроўцам Аляксандрам Тарабуевым разразалі гідраўлічным інструментам злашчасны карабін. Іх вельмі ўразіла, як сабака пры гэтым плакаў. На шчасце, усё атрымалася як мага лепш. Чатырохногі вартаўнік жывы, а раны хутка зажывуць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## Фасад з нацыянальным адценнем

**У Цэнтральным раёне сталіцы адбылося ўрачыстае адкрыццё незвычайнага жылога дома — з «вышыванкай» на фасадзе.**


Фота БЕЛТА.

Знамянальна, што адкрыццё новага дома адбылося напярэдадні 950-годдзя Мінска. Гэта першы дом у раёне, фасад якога ўпрыгожаны нацыянальным узорам, што вылучае яго сярод іншых і робіць добра прыкметным для тых, хто праязджае па Мінскай кальцавой аўтадарозе.

Перад урачыстым адкрыццём у нефармальнай абстаноўцы за кубкам гарбаты навасельцы змаглі пагутарыць з прадстаўнікамі органаў выканаўчай улады, абслугоўваючых прадпрыемстваў, будаўнікамі.

Пасля цырымоніі разразання стужкі ключы ад новых, доўгачаканых кватэр атрымалі 119 навасёлаў, з іх 60 мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

А НЕ ШКОДЗЬ!

## Граніцы трэба ведаць...

**215 дрэў розных парод, не прызначаных для высечкі, спілавалі работнікі Верхнядзвінскага лягаса. Распрацоўваючы лесасеку на тэрыторыі Стралкоўскага лясніцтва, секары добра выйшлі за яе межы. У выніку незаконна было зрэзана 39 кубаметраў лесу.**

У адносінах да лягаса работнікі Верхнядзвінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету распачалі адміністрацыйны працэс. Юрасобе трэба будзе заплаціць штраф у памеры 1380 рублёў, а таксама пакрыць нанесеную шкоду — 2,5 тысячы рублёў і кошт незаконна нарыхтаванай драўніны на суму большую за 600 рублёў.

Падобнае парушэнне выявілі работнікі Мазырскай міжраённай інспекцыі ў Рэмезаўскім лясніцтве Ельскага лягаса. Пры правядзенні высечкі лесніки таксама зайшлі на суседнюю тэрыторыю і незаконна спілавалі 49 дрэў агульным аб'ёмам 20 кубаметраў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты ляснічы, які сачыў за арганізацыяй работы на ўчастку. Яму давядзецца пакрыць каля 500 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Извещение о проведении 18 июля 2017 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

Сведения о продаваемом имуществе:

| № предмета торгов | Информация о предмете торгов | Год выпуска | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка лазерной резки с ЧПУ Platino 1530 HS-3500 (PrimaPower, Италия) Местонахождение имущества: Республика Беларусь, г. Минск, пер. С.Ковалевской, 62-2. | 2007 | 243864,00 | 12193,20 |
| 2 | Гидравлический листогибочный пресс с ЧУП BYSTRONIC Beyeler 60 2550 (BYSTRONIC, Швейцария) Местонахождение имущества: Республика Беларусь, г. Минск, пер. С.Ковалевской, 62-2. | 2007 | 72936,00 | 3646,80 |
| 3 | Компрессор винтовой воздушный EKO 110GVST (Ekomak, Турция) Место нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 30409,44 | 1520,47 |
| 4 | Компрессор винтовой воздушный EKO 110GVST (Ekomak, Турция) Место нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 30402,49 | 1520,12 |
| 5 | Индукционная тигельная плавильная электропечь ИТПЭ-0258/0,35, ТГ2, (Термолит, Украина) Место нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2011 | 40687,79 | 2034,39 |
| 6 | Индукционная тигельная плавильная электропечь ИТПЭ-04/04, ТГ2, (Термолит, Украина) Место нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 64087,20 | 3204,36 |
| 7 | Комплекс мобильный для производства легких стальных тонкостенных конструкций (Республика Беларусь) Местонахождение имущества: Республика Беларусь, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Маяковского, 1 (здание арочника), ООО «Стальтало» | 2012 | 26332,14 | 1317,61 |
| 8 | Трассовый станок RF 625-050 2012 г.в. (Scottsdale, Новая Зеландия) Местонахождение имущества: Республика Беларусь, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Маяковского, 1 (здание арочника), ООО «Стальтало» | 2012 | 106753,91 | 5337,70 |
| 9 | Профилегибочный станок RF 525-140 (Scottsdale, Новая Зеландия) Местонахождение имущества: Республика Беларусь, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Маяковского, 1 (здание арочника), ООО «Стальтало» | 2012 | 90090,29 | 4504,51 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.
Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» №3012201310011 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код 153001964, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 18 июля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.06.2017 по 14.07.2017 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.
Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by, mail: torgi@agroconsult.by
Телефоны для справок: Филиал ОАО «Белагропромбанк» – Гомельское областное управление Главный специалист отдела по работе с проблемной задолженностью Бондаренко Максим Святославович, тел. 8 (0232) 79-26-95, факс 8 (0232) 79-27-39. Организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона**

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 11.**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание производственного корпуса (литер А 1/м)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 1820,0 кв. м | 500/С-24874 |

**В состав Лота входит следующее оборудование:**
- Кран мостовой электрический подвесного типа 2-13.0-12.012, инвентарный номер 501, дата ввода в эксплуатацию – 2010 г.

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY |

**Начальная цена с НДС 20% – 242 531,92 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона – 12 126,60 белорусских рублей BYN**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|---|
| 2 | **Здание галереи (литер Г 1/к)** | Здание неустановленного назначения | 65,0 кв. м | 500/С-25651 |

**Начальная цена с НДС 20% – 12 972,14 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона – 648,61 белорусских рублей BYN**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Лоты №№1–2 расположены на неделимом земельном участке площадью 2,6107 га, предоставленном на праве постоянного пользования (для в праве 12/100) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы. Ограничения (обременения): Обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям – владельцам инженерных сооружений, площадь 2,6107 га |
| **Порядок ознакомления по лотам №№1–2** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Боков Игорь Петрович, начальник участка малой механизации, контактный телефон +375-33-604-69-58 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д.11**

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 3 | 22 | Вертикально-сверлильный станок типа 2А-135, 1964 г. в. | 640,45 | 32,02 |
| 4 | 424 | Ленточно-пильный станок типа ARG-290 PLUS, 2007 г. в. | 2 406,30 | 120,31 |
| 5 | 23 | Станок настольно-сверлильный типа КС-12 | 138,32 | 6,92 |
| 6 | 498 | Станок радиально-сверлильный типа 2К550 в комплекте со столом, тисками, патроном сверлильным резьбовым, 2010 г. в. | 11 361,04 | 568,05 |
| 7 | 17 | Токарно-винторезный станок типа 1К-62, 1966 г. в. | 1 736,78 | 86,84 |
| 8 | 527 | Установка компрессорная типа К-2, 2012 г. в. | 397,76 | 19,89 |
| 9 | 273 | Устройство для отсоса пыли, 1977 г. в. | 113,21 | 5,66 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Боков Игорь Петрович, начальник участка малой механизации, контактный телефон +375-33-604-69-58 | | |
| **Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а** | | | | |
| 10 | 517 | Навесное оборудование щетка дорожная типа НО-86 | 100,58 | 5,03 |
| 11 | 28 | Плоскошлифовальный станок типа ЗД 711 | 3 640,64 | 182,03 |
| 12 | 12 | Радиально-сверлильный станок типа 2Л 53 | 1 548,41 | 77,42 |
| 13 | 242 | Станок токарно-винторезный типа 6Б 16П | 2 887,43 | 144,37 |
| 14 | 245 | Станок точильно-шлифовальный типа 3Б634 | 552,51 | 27,63 |
| 15 | 30 | Станок универсальный токарный типа 16Е | 1 046,27 | 52,31 |
| 16 | 29 | Станок универсальный фрезерный типа 672001ф | 1 464,72 | 73,24 |
| 17 | 31 | Токарно-винторезный станок типа 1А 62 | 1 464,72 | 73,24 |
| 18 | 15 | Станок токарный типа 16 Е 16 КП | 1 213,65 | 60,68 |
| 19 | 26 | Фрезерный станок типа СФ 40 ПФ 1 | 1 464,72 | 73,24 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375-29-654-92-93 | | |

**Транспорт и спецтехника, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Гурского, 16а в составе:

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 20 | 218 | Кран КС 357721 (рег. знак АА 6063-7) | 2 544,89 | 127,24 |
| 21 | 268 | Полуприцеп ПЛ 12-12 (рег. знак 2892 АА-7), 1992 г. в. | 672,24 | 33,61 |
| 22 | 131 | Прицеп ПЛ-12-12 (рег. знак 2949 КА), 1992 г. в. | 672,24 | 33,61 |
| **Спецтехника, расположенная по адресу:** г. Кричев, ул. Комсомольская, 103а, в составе: | | | | |
| 23 | 223 | Кран РДК 250-3. 1990 г.в. | 6 962,44 | 348,12 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375-29-654-92-93 | | |
| **Транспорт и оборудование, расположенные по адресу:** г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе: | | | | |
| 24 | 456 | Грузовой специальный бетоносмеситель МАЗ 630305-249 СМБ-270 (рег. знак АВ 7826-7), 2007 г.в. | 6 298,30 | 314,92 |
| 25 | 688 | Легковой автомобиль GAZ 31105-120 (рег. номер 2326 АЕ-4), 2004 г.в. | 462,00 | 23,10 |
| 26 | 619 | Модульная автозаправочная станция | 420,00 | 21,00 |
| 27 | 893 | Сварочный аппарат «Оливер» ВД-350, 2013 г. | 798,00 | 39,90 |
| 28 | 532 | Инструменталка (склад металлический), 1980 г. | 324,00 | 16,20 |
| 29 | 580 | Нивелир Н3, 1976 г. | 31,32 | 1,57 |
| 30 | 594 | Теодолит 4Т30П, 1992 г. | 104,76 | 5,24 |
| 31 | 595 | Нивелир Н3К, 1982 г.в. | 31,32 | 1,57 |
| 32 | 385 | Люлька строительная ЛЭ-100*300, 1983 г. | 496,80 | 24,84 |
| 33 | 626 | Электролебедка, 1995 г. | 108,00 | 5,40 |
| 34 | 663 | Комплект мебели из ЛДСП, 15 предметов, 2003 г. | 216,00 | 10,80 |
| 35 | 698 | Теодолит 4Т30П, в комплекте штатив ШР, 2004 г. | 140,40 | 7,02 |
| 36 | 699 | Нивелир НВ-1, 2004 г. | 43,20 | 2,16 |
| 37 | 701 | Бетоносмеситель СБ-250, 2005 г. | 183,60 | 9,18 |
| 38 | 730 | Лебедка ручная с рычажным приводом ЛР, 2006 г.в. | 24,84 | 1,24 |
| 39 | 794 | Трансформатор понижающий НТС-1, 4 КВа, 2008 г | 25,92 | 1,30 |
| 40 | 799 | Влагомер МГ-4, 2008 | 432,00 | 21,60 |
| 41 | 807 | Лебедка ручная рычажная грузоподъемностью 3,2 т, 2008 г | 41,04 | 2,05 |
| 42 | 824 | Инвертор сварочный Telwin Technology 210HD, 2009г. | 183,60 | 9,18 |
| 43 | 852 | Установка малярная СО-244, 2011 г. | 388,80 | 19,44 |
| 44 | 854 | Вибратор глубинный ИВ-117А, 2011 г. | 59,40 | 2,97 |
| 45 | 857 | Стол с приставкой из ЛДСП, 2011 г. | 270,00 | 13,50 |
| 46 | 858 | Набор корпусной мебели , 2011 | 291,60 | 14,58 |
| 47 | 861 | Сварочный полуавтомат Eland MIG-250N, 2012 г. | 205,20 | 10,26 |
| 48 | 871 | Лебедка электрическая PA1000, 2012 г. | 65,88 | 3,29 |
| 49 | 876 | Ноутбук Toshiba, модель Satellite C870-D7K, арт. PSC8CR-00G001RU, с сумкой, 2013 г. | 140,40 | 7,02 |
| 50 | 889 | Мотокоса Stihl FS-130, 2013 г. | 291,60 | 14,58 |
| 51 | 899 | Сабельная пила Hitachi CR13V2, 2014 г. | 172,80 | 8,64 |
| 52 | 903 | Пылесос Hitachi CR13V2, 2014 г. | 410,40 | 20,52 |
| 53 | 906 | Шуруповерт аккумуляторный Bosh GSR-1440-Li, 2014 г | 108,00 | 5,40 |
| 54 | 910 | Дрель ударного действия Bosch GSB13, 2014 г | 65,88 | 3,29 |
| 55 | 915 | Пила торцово-усовочная Hitach C10FCH2, 2014 г | 87,48 | 4,37 |
| 56 | 919 | Мешалка электрическая Einhell BT-MX1400E, 2015 г. | 97,20 | 4,86 |
| 57 | 921 | Перфоратор Bosch GBH 2-28 DFV, 2015 г. | 216,00 | 10,80 |
| 58 | 321 | Ключ электронный динамометрический ЭДК1-1500, 2016 г. | 410,40 | 20,52 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Марчик Петр Иванович, директор филиала СУ-110, контактные телефоны: 8-0152-530-712 (716, 728) | | |
| **Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254, в составе: | | | | |
| 59 | 150081 | Автомобиль УАЗ-3303-018, рег. №АВ 3985-3 (1994 г.в.) | 1 061,55 | 53,08 |
| 60 | 930 | Автомобиль грузовой бортовой МАЗ (MAZ) 53371 (1990 г.в.) | 655,20 | 32,76 |
| 61 | 998 | Автобус-вагон ГАЗ (GAZ)–2705 (2000 г.в.) | 533,80 | 26,69 |
| 62 | 150035 | Полуприцеп бортовой МАЗ (MAZ) 938662-043, 2007 г.в. | 1 407,40 | 70,37 |
| 63 | 501 | Ножницы листовые металлические НД3318Б | 1 189,00 | 59,45 |
| 64 | 1008 | Подъемник К-1В с электролебедкой | 182,00 | 9,10 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00 по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, производитель работ, контактные телефоны: +375 29-603-49-02 (Velcom), 8-0232-46-09-03. | | |
| **Транспорт и оборудование, расположенные по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д,** в составе: | | | | |
| 65 | 373 | Подмости ПВС 12, 1979 г. в. | 2 115,79 | 105,79 |
| 66 | 242 | Преобразователь частоты ПЧ-4/42-200У2 (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 163,20 | 8,16 |
| 67 | 36 | Станок вертикально сверлильный 2С132 (1990 г. в.) | 1 172,95 | 58,65 |
| 68 | 997 | Тележка гидравлическая (PFAFF 20-115) (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 96,46 | 4,82 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 120/2** | | | | |
| 69 | 81 | Динамометрический ключ ЭДК 1-1500, 2005 г. в. | 352,80 | 17,64 |
| 70 | 349 | Лебедка электрическая ТЛ-7А-1, 1987 г. в. | 840,00 | 42,00 |
| 71 | 255 | Сварочный агрегат АДД-4004М, 2004 г. в. | 2 415,00 | 120,75 |
| 72 | 248 | Станция подогрева бетона КТП-ТО 80-86 У-1, 1990 г. в. | 385,00 | 19,25 |
| 73 | 22 | Точильно-шлифовальный станок 3М634, 1968 г. в. | 175,00 | 8,75 |
| 74 | 108 | Токарно-винторезный станок CU-400, 1987 г. в. | 3 969,00 | 198,45 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, директор филиала СУ-159, контактный телефон +375 29 6592523 | | |
| **Оборудование, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 78а,** в составе: | | | | |
| 75 | 4098 | Блок контейнер БК-1, 2014 г. | 1 073,00 | 53,65 |
| 76 | 596 | Подмости б/у | 1 733,31 | 86,67 |
| 77 | 633 | Подмости передвижные электрические ППЭ-12.01.А | 2 558,69 | 127,93 |
| **Порядок ознакомления** | | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Куткович Александр Александрович, производитель работ, +375 29 246 68 24; Жаглевский Дмитрий Давыдович, директор филиала СУ-86, контактный телефон +375 29 601 62 44 | | |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». Номер счета в формате IBAN (BYN): BY60BLBB30120191021390001001 БИК в формате IBAN: BLBBBY2X

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–2** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.
**По лотам №№3–77** не более 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона по лотам №№1–27, 59–77 опубликовано в г. «Звязда» 13.05.2017 г., по лотам №№28–58 в г. «Звязда» от 29.11.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **29.06.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **27.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

ЁСЦЬ СТАНДАРТ

# «ХУТКАЯ ДАСТАЎКА» СА СПЕЦЫФІКАЙ

## Як працуюць комплексныя прыёмныя пункты і каму яны патрэбны?

**З таго часу, як чалавек пачаў ваўсю асвойваць лічбавыя прасторы, інтэрнэт-крамы абяцаюць даставіць патрэбную рэч практычна да парога. Але тое ў гарадах. А вясковы жыхар па старой звычцы кіруецца альбо ў найбліжэйшы раённы цэнтр, альбо да мясцовага комплекснага прыёмнага пункта. Іншая справа, што сёння можа прапанаваць КПП свайму наведвальніку?**



**«Спецыфіка работы на вёсцы — трэба знаходзіць агульную мову з кожным пакупніком», — лічыць дырэктар КБА Камянецкага раёна Анатоль ХОМІЧ *(у цэнтры).***

Калі паглядзець на праграму развіцця вёскі, то ў аграгарадку, акрамя ўжо згаданай установы, павінны быць ФАП, пошта, школа — уся неабходная інфраструктура. Насамрэч жа мы бачым, што ў маленькіх вёсачках бытавыя паслугі застаюцца незапатрабаванымі. Што далей — здагадацца няцяжка. Пасля аптымізацыі будынак аказваецца не пры справе, а жыхары падладжваюцца пад новыя ўмовы.

— Калі я толькі прыйшоў на работу ў 2010 годзе, ва ўсіх раёнах былі камбінаты бытавога абслугоўвання. А потым ільготы для фінансавання паступова пачалі знікаць, бытавыя паслугі сталі далучаць да абавязкаў ЖКГ, як, напрыклад, было зроблена ў суседнім Бярозаўскім раёне. Камунальнікі больш свабодныя ў плане грошай, адпаведна, і магчымасцей у іх як бы больш. Яшчэ адзін сусед — Кобрынскі раён — прапаноўвае займаць нішу бытавых паслуг на сяле прыватнікам. У мяне ж пакуль работу пераняць ніхто не хоча, — тлумачыць **Анатоль ХОМІЧ, дырэктар камбіната бытавога абслугоўвання Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.** На кантролі гэтага КБА сёння знаходзяцца 15 комплексных прыёмных пунктаў, 14 з іх — у сельскай мясцовасці.

### Вітаем тым, што маем

Першы наш прыпынак — у аграгарадку Турна Вялікая. Нягледзячы на назву, жыве тут усяго каля 500 чалавек, большая частка дарослых працуе ў мясцовым калгасе. Прыёмны пункт выглядае стандартна. Калісьці такія модулі з металапластыку выпускалі па прапанове Белбыту, а тыповую канструкцыю манціравалі потым адразу на месцы. Унутры, як і звонку, пануе мінімалізм, хоць ні зацёртай падлогі, ні абсыпаных сцен не відаць. Прыёмшчыца Тацяна Гамзюк паказвае асартымент рэчаў і паслуг. На першы погляд, выбар небагаты. Некалькі варыянтаў пасцельнай бялізны, коўдры, падушкі, скрыні з посудам. На вешалцы чатыры-пяць халатаў і камізэлек.

— Гэта ўзоры, — тлумачыць прыёмшчыца. — Усю прадукцыю КБА шые самастойна, але адразу завозіць вялікую партыю тавараў не можа. Пакупнікі бачаць прапанаваныя мадэлі і па іх замаўляюць варыянт для сябе, прычым папярэдне можна абгаварыць параметры: памер, колер. Усе пажаданні я запісваю ў журнал, а потым аддаю заказы на камбінат. Праз тыдзень, калі прыязджае машына з новым таварам, чалавек можа забраць сваю рэч.

Акрамя гэтага, на КПП адзенне можна яшчэ і адрамантаваць або здаць у хімчыстку. Вяскоўцы нясуць сюды абутак для рамонту, заказваюць майстра па рамонце мэблі, бытавой тэхнікі... Асаблівай папулярнасцю карыстаецца работа цырульніка. А ў невялікім пакойчыку Тацяна Гамзюк захоўвае труну і вянкі — рытуальныя паслугі для КПП таксама абавязковыя.

Раз на тыдзень жанчына бярэ машыну і аб'язджае суседнія вёсачкі. Там яна ўжо наладжвае кантакты са старастамі. І калі раптоўна хто з жыхароў захоча памяняць мэблю, адрамантаваць што-небудзь ці падстрыгчыся — тэлефануюць у Турну Вялікую, і Тацяна высылае майстра.

— Праблема ў тым, што аграгарадок наш невялікі, — разважае Анатоль Хоміч. — За месяц агульная выручка тут складае каля тысячы рублёў. Зімою, калі ўлічыць, што ацяпляецца КПП электрычнасцю, гэтай сумы не заўсёды хапае, нават каб пакрыць тарыф. Але закрываць пункт таксама нельга.

Так што замест аптымізацыі будынкаў ідзе аптымізацыя працы. У ідэале цырульнік, швачка і майстар па рамонце абутку павінны мець пастаяннае месца ў аграгарадку. Насамрэч жа цырульніка прывозіць вадзіцель раз на тыдзень, а рамантуюць туфлі на КБА. Тацяна Сцяпанаўна, як і іншыя прыёмшчыцы, прайшла навучанне на курсах швачак у Брэсце. Са складанай работай яна можа і не справіцца, але падкараціць даўжыню штаноў, ушыць «маланку» — ніякіх пытанняў. Прычым за такую падпрацоўку жанчына мае 50 працэнтаў ад кошту паслугі. Хоць на вялікі заробак усё роўна разлічваць не прыходзіцца. Прыёмшчыцы за рэалізацыю цырульніцкіх, рытуальных паслуг і рамонту абутку атрымліваюць 9 працэнтаў ад выручкі. За ўсё астатняе, напрыклад, продаж спадарожных тавараў, шытых вырабаў, — 7 працэнтаў. Усяго на палове стаўкі з даплатамі атрымліваецца каля 150 рублёў у месяц.



**У аграгарадок Каменюкі цырульнік прыязджае двойчы на тыдзень. Асабліва многа наведвальнікаў запісваецца на суботу.**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Вялікі заробак тут не атрымаеш, — тлумачыць дырэктар камбіната. — І я, і прыёмшчыцы гэта разумеем. Так што стараюся стварыць умовы, каб чалавек мог дадаткова чымсьці займацца, падпрацоўваць. Напрыклад у Турне Вялікай КПП адчынены з 10 да 14 гадзін, увесь астатні час для Тацяны вольны.

### Мы тут — свае людзі

Пакуль пераязджаем на новае месца, Анатоль Хоміч разважае пра кантынгент наведвальнікаў. Можа падацца, што замаўляюць бытавыя паслугі людзі пажылыя, якім цяжка выбірацца ў горад. Аднак насамрэч малюнак зусім іншы. Пенсіянеры часта падтрымліваюць грашыма дзяцей, а самі кіруюцца прынцыпам эканоміі: «Хай мяне сусед пастрыжэ, усё роўна ніхто не ўбачыць, а стрыжка танней абыдзецца». Затое маладым сем'ям пастаянна нешта трэба ў гаспадарцы, а выехаць у горад часта не дазваляе работа. Ды і цэны ў магазінах «кусаюцца», калі параўноўваць з цэннікамі на КПП.

— Я не ведаю, як бы тут жылі без комплекснага пункта. Калі яго зачыніць, людзі будуць абураца, — паказвае свае «ўладанні» Марыя Марчук, прыёмшчыца ў аграгарадку Каменюкі. — Тут жыве прыблізна паўтары тысячы чалавек, многія маюць работу ў Белавежскай пушчы, не кожны ў будні дзень можа на гадзіну з працы вырвацца. За абед хіба ў краму па хлеб паспееш заскочыць. А я па чацвяргах пачынаю падворны абход. Іду да крамы, заглядаю да некаторых у двор... Калі чалавек пажылы, ён мне сам тэлефануе, каб зазірнула, забрала той жа абутак на рамонт. Або калі сям'я працуе, я магу прынесці ім дадому коўдру з хімчысткі.

Марыя Кузьмінічна ў сваёй працы пачэсны ветэран. Мае падзякі і ганаровыя лісты, але лепш за ўсё пра бездакорную работу кажа стаж. На КПП у родных Каменюках жанчына працуе з 1981 года. Так што мясцовыя сваю прыёмшчыцу ведаюць амаль з дзяцінства і давяраюць ёй.

Давер да работніка — гэта адна са спецыфічных рыс работы на вёсцы. Дзякуючы яму комплексныя прыёмныя пункты вытрымліваюць канкурэнцыю з прыватнымі цырульнямі і майстэрнямі ў вялікіх аграгарадках. Калі майстар адпрацаваў побач з жыхарамі па 20—30 гадоў, у яго склалася кола пастаянных кліентаў. Ні да каго іншага гэтыя людзі ўжо не пойдуць.

— Фізічна праца нескладаная, а вось псіхалагічна трэба ўмець прыстасоўвацца. Прыёмшчык лічыцца матэрыяльна адказнай асобай, акрамя таго, у вёсцы я ўсіх ведаю, а ўсе ведаюць мяне. Калі раптам нейкі брак здарыцца ў КБА, то скардзіцца чалавек усё роўна прыйдзе да мяне. Таму трэба шукаць падыход да кожнага, каб не пакрыўдзіць і не сапсаваць адносіны. Выпраўляем, просім прабачэння, супакойваем, але гэта вельмі рэдкія сітуацыі. Падзякі часцей чуеш, — кажа Тацяна Шэмяцюк, прыёмшчыца ў аграгарадку Відамля.

### Балансаванне на «залатой сярэдзіне»

Апошні прыпынак — у аграгарадку Белавежскі. Тут на комплексным прыёмным пункце працуе не толькі прыёмшчыца. У суседніх пакоях абсталяваны месцы для швачкі і майстра па рамонце абутку. Так што кашулі пакупнік атрымлівае ў літаральным сэнсе «адразу з-пад іголкі», а адрамантаваныя боты можна забіраць вечарам таго ж дня. Праўда, па словах дырэктара КБА, такую раскошу, як тры пастаянныя работнікі, камбінат можа дазволіць сабе толькі ў перспектыўных населеных пунктах з моцным калгасам і вялікай колькасцю працаздольных жыхароў.

— Цяжка знайсці сапраўды ўмелых майстроў, якія будуць згодны на невялікую зарплату і непастаянны попыт на свае паслугі. Даплачваць пэўную суму за кошт камбіната — таксама тупіковае рашэнне, гэта значыць працаваць сабе ў страту, — кажа Анатоль Хоміч. — Таму ў маленькіх КПП здаём незанятыя памяшканні ў арэнду ўласнікам, якія таксама аказваюць бытавыя паслугі. Тое ж самае і з плошчамі ў Доме быту. Індывідуальны прадпрымальнік атрымлівае гандлёвае месца, а КБА, акрамя прыбытку ад арэнды, дадатковa «збірае» пад адным дахам усе магчымыя паслугі: ад продажу новай мэблі да рамонту ноўтбукаў. Цяпер некаторыя КБА заключаюць дагаворы з іншымі арганізацыямі — на выраб мэблі, пашыў спецыяльнага адзення, пасцельнай бялізны. Але тут ёсць свае непрыемныя нюансы, і для мяне яны больш істотныя, чым магчымая выгада. Так што мы займаемся толькі работай з насельніцтвам. Лічу, што нашаму камбінату гэта ўдаецца: знаходзіць сярэдзіну паміж аптымізацыяй і патрэбамі людзей.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*Камянецкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 13 чэрвеня 2017 года.**

■ Псіхалогія для ўсіх

# ГЭТА МАНІПУЛЯЦЫЯ!

**Найлепшая зброя супраць маніпулятара — мір. Не варта атакаваць першым. Агрэсару проста трэба даць зразумець, што сваіх мэт ён не дасягне.**

Навакольныя нярэдка спрабуюць кіраваць нашымі паводзінамі. У псіхалогіі гэта называецца маніпуляцыяй. І самае важнае — усвядоміць, што гэта менавіта яна. Як толькі мы гэта ўсвядомілі, пачынаюць прачынацца абарончыя механізмы.

